Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІПЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 135 (29757)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ



АРХІТЭКТУРНЫЯ БАТАЛІІ ПА-ВЯСКОВАМУ
МС

БЫВАЮЦЬ РОДНЫЯ, ЯК ЧУЖЫЯ...
12



## КОРАТКА

• **Міністэрства аховы здароўя абнавіла пералік медпаказанняў для атрымання адукацыі дома.**

• На адзін з самых высокіх пунктаў Віцебска ўзнялі Дзяржаўны сцяг Беларусі.



## ЦЫТАТА ДНЯ



**АЛЯКСАНДР ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Паводле ацэнкі нашых спецыялістаў, у студзені — чэрвені тэмп росту ВУП складзе каля 96 %. Запавольненне з'яўляецца вымушаным і звязана са структурнымі зменамі, у першую чаргу ў знешнім гандлі. Пры гэтым эканоміка працуе ўстойліва і збалансавана. Нашы вытворчыя флагманы ўжо сфарміравалі партфелі заказаў на другое паўгоддзе. Збалансаваны знешні гандаль таварамі і паслугамі: дадатнае сальда за пяць месяцаў — плюс $1,7 млрд. Гэта найлепшы паказчык з 2012 года. Істотна запаволіўся тэмп росту цэн. Калі ў сакавіку яны прыраслі на 6,1, то ў чэрвені — на 1,1. Значна палепшыліся фінансавыя вынікі арганізацый: павялічыліся іх чысты прыбытак і рэнтабельнасць, скарацілася пазыковая нагрузка. Сярэдняя зарплата за пяць месяцаў вырасла на 14,5 працэнта і дасягнула Br1561. Дзяржава ў поўнай меры выконвае свае абавязацельствы перад насельніцтвам. Такім чынам, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы задачы, каб нашы людзі не адчулі санкцый, а прадпрыемствы не спыняліся, выконваюцца».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «ЯК НІКОЛІ НА НАС, ВАЕННЫХ, НАШЫ ЛЮДЗІ ГЛЯДЗЯЦЬ З ВЯЛІКАЙ НАДЗЕЯЙ»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўзяў удзел у цырымоніі ўшанавання выпускнікоў ваенных ВНУ і вышэйшага афіцэрскага складу

**Кіраўнік дзяржавы ўручыў пагоны генерал-маёра намесніку камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Дзмітрыю Міхалапу, генерал-маёра міліцыі — начальніку ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Андрэю Любімаву, генерал-маёра юстыцыі — начальніку ўпраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці Эдуарду Маліноўскаму, дзяржаўнага саветніка мытнай службы ІІІ рангу — начальніку Мінскай рэгіянальнай мытні Сяргею Іванову. Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Беларусі выпускнікам, якія скончылі ваенныя навучальныя ўстановы з выдатнымі паказчыкамі ў вучобе.**

Вітаючы ўдзельнікаў цырымоніі, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што яны завяршылі навучанне ў няпросты час. Па яго словах, нашым сілавым ведамствам вельмі патрэбныя афіцэры, якія ведаюць сваю справу, адданыя краіне і дзяржаве.

«Сёння мяняецца не толькі свет, мяняюцца самі арміі, спосабы вядзення ваенных дзеянняў. У войскі паступаюць новыя высокатэхналагічныя ўзоры ўзбраенняў. Інтэлект запатрабаваны як ніколі, што, у сваю чаргу, патрабуе не толькі ад афіцэраў, але і ад салдат і сяржантаў глыбокіх ведаў. І такая тэндэнцыя будзе толькі ўзмацняцца. Але перадаць гэтыя веды сваім падначаленым можаце толькі вы.

СТАР. 2



Фота БелТА.

Выпускніку факультэта Генеральнага штаба Ваеннай акадэміі Аляксею ЯНКОЎСКАМУ аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта.

Турызм

# Рэгіёны чакаюць гасцей

**Гэтае лета зноў абяцае стаць гарачым для турыстычнай галіны. Адпачывальнікі з розных куткоў Беларусі і замежжа штурмуюць санаторыі і гатэлі, сядзібы і базы адпачынку, падарожнічаюць на ўласных аўто і аўтобусах, роварах і байдарках. Рэгіёны не застаюцца ў баку — яны падрыхтавалі шмат сюрпрызаў.**

СТАР. 5



Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# КАЛІ РАЗРАД МОЖА СТАЦЬ СМЯРОТНЫМ

## Як пазбегнуць непрыемнасцяў падчас навальніцы і моцнага ветру?

**Надвор'е апошнім часам досыць няўстойлівае: то пячэ, то залівае. І калі ў першым выпадку пачашчаецца гібель людзей на вадзе, то ў навальніц свае наступствы. Парушаецца электразабеспячэнне жылых дамоў і аб'ектаў, разбураюцца пабудовы, пашкоджваецца транспарт... Нячаста, але церпяць ад непагадзі і людзі.**

СТАР. 4



Фота з адкрытых крыніц.

# «ЯК НІКОЛІ НА НАС, ВАЕННЫХ, НАШЫ ЛЮДЗІ ГЛЯДЗЯЦЬ З ВЯЛІКАЙ НАДЗЕЯЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы заўсёды гэта разумелі і рабілі адпаведныя высновы. Таму ***палітыка нашай дзяржавы, накіраваная на падтрымку чалавека ў пагонах і мадэрнізацыю Узброеных Сіл, — галоўнага гаранта суверэнітэту і незалежнасці Беларусі, была і застаецца нязменнай. Павінен вам сказаць, што гэтая палітыка ў плане сацыяльнай абароны нашых ваенных, увогуле сілавых структур будзе ўзмоцнена ўжо з наступнага года»,*** — адзначыў Прэзідэнт.

Беларускі лідар нагадаў, што поспехі ў вайсковым будаўніцтве даліся няпроста. Дваццаць пяць гадоў таму аб прафесіі ваеннага ішло шмат крыватолкаў. Многія з удзельнікаў сённяшняй цырымоніі ў той час яшчэ не насілі пагоны. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, тады ў так званай ліберальнай прэсе сур'ёзна абмяркоўвалася пытанне «Навошта нам армія?», а святкаванне Дня Перамогі і правядзенне парадаў «прасунутыя» журналісты называлі «победобесием».

«Але ўсё чужое нашаму народу надоўга не прыжываецца і адыходзіць у бок. Прафесія афіцэра сёння ганаровая і паважаная. Застаюцца і захоўваюцца сапраўдныя каштоўнасці: вера, абавязак перад сваім народам, служба на карысць Айчыны», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Асабліва гэта відаць на прыкладзе міліцыі, куды сёння маладыя людзі ідуць з вялікім жаданнем.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не затрымаліся ў беларусаў і нядаўнія ідэі Захаду — разладзіць сітуацыю знутры, пасеяць хаос і разбурыць нашу дзяржаву. «Мы змаглі супрацьстаяць ашалеламу ціску на нас з боку тых, хто жадаў дзяржаўнага перавароту праз мяцеж. Вы гэта ўсё назіралі. ***Разам з сапраўднымі патрыётамі Беларусі мы захавалі мір у нашай краіне. Аднак падзеі, якія сёння разгарнуліся вакол Беларусі і Расіі, патрабуюць гранічнай пільнасці і канцэнтрацыі»,*** — заўважыў ён.


Фота БелТА.

Прэзідэнт канстатаваў, што краінамі Захаду пры адкрытым дырыжорстве Злучаных Штатаў паслядоўна, метадычна і нават насуперак уласным нацыянальным інтарэсам і жаданням народаў разбураецца сістэма глабальнай бяспекі. У выніку гэтая мэтанакіраваная палітыка прывяла да ваеннага канфлікту ва Украіне.

«Упэўнены, што падчас вучобы ў ваенных ВНУ вы ўважліва вывучалі развіццё ваенна-палітычнай абстаноўкі і выдатна разумееце тое, што адбываецца на нашых заходніх граніцах. ***Пад выглядам узмацнення абароны Еўропы і рознага роду «абарончых» вучэнняў краінамі НАТА фарміруецца браніраваны кулак, які ствараецца відавочна не для абароны. Відаць, наваяўленыя «крыжаносцы» з Паўночнаатлантычнага альянсу раптам вырашылі, што надыходзіць зручны момант для чарговага «кідка на ўсход», забыўшыся, чым скончыліся аналагічныя паходы для іх гістарычных папярэднікаў»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ РАЗВЯЗАНА ПОЎНАМАШТАБНАЯ ГІБРЫДНАЯ ВАЙНА

Галоўнакамандуючы расказаў, што заходнімі краінамі на зямлі і ў паветры актыўна вядзецца разведка, асвойваецца ваенная лагістыка, праводзяцца вучэнні, перакідваюцца тэхніка і запасы з іншых рэгіёнаў, паралельна павялічваюцца ваенныя бюджэты.

«Апошнім часам (і мы гэта падрабязна абмяркоўвалі з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі) распрацоўваюцца стратэгічныя планы нападзення на Расію. І галоўны напрамак удару (гісторыя паўтараецца) — праз Украіну і праз Беларусь», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Нейтральныя Швецыя і Фінляндыя раптам выказалі жаданне тэрмінова далучыцца да НАТА, і кіраўніцтва блока, насуперак сваім правілам, гатовае ў паскораным парадку прыняць іх у альянс. Ён звярнуў увагу, што гэта робіцца, нават не пытаючыся, што думаюць народы тых краін. На саміце НАТА, які нядаўна адбыўся, заяўлены намеры прынцыпова ўзмацніць сваю прысутнасць і ўплыў у Еўропе.

«Адначасова нарастае ціск на нас і ў іншых сферах, перш за ўсё ў эканамічнай і інфармацыйнай. Гэта ў чарговы раз пацвярджае — ***супраць Беларусі развязана поўнамаштабная гібрыдная вайна, якая заўсёды носіць наступальны характар. І ў гэтай вайне задзейнічаны як нацыянальныя, так і кааліцыйныя структуры Паўночнаатлантычнага блока, якія спецыялізуюцца на правядзенні псіхалагічных аперацый і падрыўных дзеянняў у кіберпрасторы»,*** — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама заўважыў, што адначасова робіцца спробы расколоць эканамічныя і палітычныя саюзы, у якія ўваходзяць Беларусь і Расія. Масіраваны ціск прывёў да таго, што, на жаль, некаторыя саюзнікі па АДКБ і СНД займаюць чакальную пазіцыю. «Але пры гэтым палітыка Беларусі не пахіснулася, мы падтрымліваем дыялог з краінамі, якія паважаюць наша меркаванне і нашы інтарэсы», — сказаў ён.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, трэба разумець, што свет ранейшым ужо не будзе. Падзеі, якія сёння адбываюцца, — гэта рашучыя крокі па шляху да шматпалярнага светаўладкавання, спынення амерыканскай гегемоніі, у інтарэсах захавання якой нарошчваюцца групоўкі войскаў, падтрымліваецца неанацысцкая ідэалогія і адкрыта фашысцкія рэжымы вакол непажаданых краін. «На жаль, такая палітыка Захаду набліжае мір да бездані вялікай вайны, у якой пераможцаў не будзе», — канстатаваў ён.

## БУДЗЬЦЕ ВАРТЫЯ ДАВЕРУ

Галоўнакамандуючы падкрэсліў, што афіцэры прыйдуць у армію і органы кіравання ў перыяд, калі і вуха трэба трымаць востра, і порах у парахаўніцах сухім. Ён зрабіў акцэнт на тым, што ніколі яшчэ ў сучаснай гісторыі наша краіна не сутыкалася з такім беспрэцэдэнтным узроўнем пагроз і выклікаў нацыянальнай бяспецы.

«Перакананы, што вы зможаце забяспечыць мірнае жыццё нашых грамадзян і стабільнасць у грамадстве. ***Як ніколі на нас, ваенных людзей, глядзяць нашы людзі з вялікай надзеяй»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні — гэта тыя дзяржаўныя інстытуты, якія карыстаюцца вялікай падтрымкай і даверам народа. ***«Людзі вераць, што мы, афіцэры, зробім усё магчымае, ды і немагчымае для абароны Айчыны. І ў нас няма права іх падвесці.*** Будзьце ж вартыя гэтага даверу», — дадаў ён.

Галоўнакамандуючы павіншаваў выпускнікоў з паспяховым заканчэннем вучобы, камандзіраў — з прысваеннем генеральскіх званняў. Ён пажадаў усім моцнага здароўя, міру, дабра, дабрабыту і поспехаў у гэтай цяжкай, але святой справе служэння Айчыне.

«Мы — людзі ваенныя, нас рыхтуюць для вайны, але мы павінны зрабіць усё, каб гэтай вайны не было», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Каментарый у тэму

**Дзмітрый МІХАЛАП, намеснік камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны:**

— Вядома, з дзяцінства марыў стаць ваенным, і мая мара здзейснілася. А званне генерала — гэта не толькі высокая пасада, але і высокая адказнасць, і заслуга ўсяго калектыву. Бо пад нашым камандаваннем салдаты, прапаршчыкі, афіцэры выконваюць важныя дзяржаўныя задачы, выконваюць на высокім прафесіянальным узроўні. Задачы ў нас заўсёды адны — абарона нашай Айчыны, яе паветраных рубяжоў. Мяняюцца толькі ўмовы — у адпаведнасці з ваенна-палітычнай сітуацыяй яны ўскладняюцца. Мы гатовыя і аператыўна рэагуем на ўсе выклікі і пагрозы.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### З-за харчовага крызісу ў свеце ў Еўрасаюзе прагназуюць наплыў мігрантаў

**У Еўрасаюзе прагназуюць рост тэмпаў міграцыі ў еўрапейскія краіны на фоне павышэння кошту прадуктаў харчавання і энергарэсурсаў у свеце, паведамляюць РІА «Навіны».**

Еўрапейскі камісар па ўнутраных пытаннях Ілва Ёхансан лічыць, што з-за нарастаючых крызісных з'яў людзі не змогуць адчуваць сябе абароненымі ў сваіх краінах, таму будуць спрабаваць эміграваць.

Яна таксама лічыць, што інфляцыя можа прывесці да нестабільнасці ў некаторых краінах, гэта прывядзе да росту злачыннасці і тэрарыстычнай пагрозы.

Маштабы міграцыі ў краіны ЕС, на думку Ёхансан, спрагназаваць у дадзены момант нельга. Еўракамісар заклікала еўрапейскія ўлады распрацаваць план дзеянняў у выпадку росту міграцыі. Таксама яна адзначыла, што Еўрасаюз прыкладае намаганні, каб не дапусціць наплыву мігрантаў.

### У Расіі пацверджаны першы выпадак воспы малпаў

**У РФ пацвердзілі першы выпадак заражэння воспай малпаў. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на прэс-службу Роспажыўнагляду.**



Захворванне выяўлена ў маладога чалавека, які вярнуўся з паездкі па еўрапейскіх краінах. Грамадзянін звярнуўся ў медустанову з характэрным сыпам. Біяматэрыялы, узятыя ў яго, былі аператыўна накіраваны для правядзення тэсціравання на наяўнасць воспы малпаў. Па выніках даследавання ў маладога чалавека было пацверджана гэтае захворванне.

### Імя новага прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі будзе названа 5 верасня

**Жыхары Вялікабрытаніі даведаюцца імя новага кіраўніка ўрада і лідара кансерватараў 5 верасня. Пры гэтым спіс імёнаў кандыдатаў будзе абвешчаны ўжо сёння, паведамляе ТАСС.**



Па словах кіраўніка парламенцкага Камітэта 1922 года, які адказвае за працэс абрання чарговага партыйнага лідара, Грэма Брэйдзі, імя новага кіраўніка брытанскага Кабміна стане вядомым пасля вяртання парламента з летніх канікулаў. Ён таксама выказаў спадзяванне, што працэс абрання новага прэм'ера не зацягнецца.

Вылучэнне кандыдатаў на пасаду прэм'ера адбудзецца 12 ліпеня. Далей пройдзе некалькі раўндаў галасавання, у выніку якіх адбудзецца адсеў кандыдатаў. Да 21 ліпеня застануцца толькі два прэтэндэнты. Хто з іх стане новым кіраўніком урада, вырашаць члены кіруючай Кансерватыўнай партыі.

Грамадзянская супольнасць

# НА ПЕРАДАВОЙ ДОБРЫХ І ПАТРЭБНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

## У самай масавай жаночай арганізацыі краіны — новая старшыня

**Кіраўніком Беларускага саюза жанчын учора на пасяджэнні праўлення грамадскай арганізацыі была абрана Вольга Шпілеўская. У ходзе пасяджэння былі таксама падведзены вынікі работы арганізацыі за перыяд з 2020 да 2022 года і вызначаны асноўныя шляхі яе далейшага развіцця.**



Фота БелТА.

«Калі выбіраецца новы кіраўнік — гэта заўсёды падвядзенне вынікаў, — сказала падчас пасяджэння **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** — Тая ўвага, якую ўдзяляе Прэзідэнт рабоце менавіта гэтай арганізацыі, дарагога варта для ўсіх членаў БСЖ. Тут прысутнічае актыў, і вы прымалі правільнае і не вельмі простае рашэнне. Заўсёды хвалюеца, калі змяняецца кіраўнік. Алена Богдан сёння займае іншую пасаду. Сістэма аховы здароўя — гэта практычна паўкраіны, і ад таго, як будзе працаваць гэтая сістэма, залежаць жыцці людзей. Гэта вельмі вялікая адказнасць у гэты няпросты перыяд. І сумяшчаць працу ў рэспубліканскай арганізацыі ў 150 тысяч чалавек — сур'ёзная адказнасць. Я хацела б падзякаваць Алене Богдан за тую работу, якая праводзілася пад яе кіраўніцтвам у арганізацыі».

Спікер падкрэсліла: гэта быў няпросты час. «Гэта 2020—2022 гады, калі тыя працэсы, якія адбываюцца ў свеце, наклалі адбітак і на нашу краіну. Гэта геапалітычны падзел свету, і заўсёды меў рацыю ў сваіх прадказаннях Прэзідэнт, што гэта будзе. Калі кіраўнік дзяржавы гаварыў аб важнасці грамадскіх арганізацый, мы выдатна разумелі, што гэта сапраўды апора дзяржаўнай улады. І калі мы адпрацоўваем законапраект аб грамадскіх арганізацыях, мы разглядаем БСЖ менавіта ў гэтым разрэзе. Гэта сапраўды апора дзяржаўнай улады ў краіне. Жанчына павінна быць прапаведнікам міралюбнасці, дабра, шчырасці, сумленнасці і прыстойнасці, як гэта і ёсць у нашай краіне, — адзначыла яна. — Гэтыя гады былі няпростыя. І арганізацыя рабіла ўсё, каб яе шэрагі пашыраліся, каб у арганізацыю прыходзіла моладзь. Прыемна бачыць маладзёжнае крыло, гэта вельмі важна».

«Беларускі саюз жанчын — важны элемент грамадзянскай супольнасці. У нашым грамадстве давер да жанчыны вельмі высокі. І таму быць па-за рознымі ініцыятывамі, рознымі праектамі нашы жанчыны не могуць, — сказаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ.** — Прыемна, што Беларускі саюз жанчын узначаліла, можна сказаць, наша калега — Вольга Шпілеўская. У яе ўсё атрымаецца, і мы са свайго боку, вядома ж, гатовыя любыя ініцыятывы рэалізоўваць разам і самім падключыцца да таго, каб дасягнуць найлепшых вынікаў у прасоўванні ініцыятыў жанчын».

Жанчына робіць наш свет дабрэйшым, больш спакойным і мерным, падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. «Жанчына выхоўвае ў дзецях міралюбівыя адносіны да жыцця, да таго, каб рабіць Беларусь квітнеючай дзяржавай, — адзначыў ён. — 150 тысяч членаў у БСЖ, але, думаю, любая жанчына падтрымлівае тыя ідэі і ініцыятывы, якія рэалізоўваюцца Беларускім саюзам жанчын. Тут, на мой погляд, не столькі важнае сяброўства, колькі ўцягванне жанчыны ў грамадскае жыццё. Яна, як правіла, занятая хатняй гаспадаркай, работай. Вы бачыце, колькі тут кіраўнікоў прадпрыемстваў, але гэта не перашкаджае ім быць уцягнутымі ў грамадскае жыццё, у ініцыятывы, у падтрыманне міру не толькі ў сям'і, але і ў цэлым у краіне».

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ** падчас пасяджэння адзначыла: «Вы цудоўна ведаеце адносіны нашага Прэзідэнта да беларускай жанчыны. Да простай беларускай жанчыны і да ўсіх беларускіх жанчын. Гэта безумоўны давер і гэта безумоўная любоў. Але ў сувязі з гэтым на БСЖ накладаецца вельмі сур'ёзная адказнасць. Я абсалютна ўпэўненая, што Беларускі саюз жанчын ведае, што яму рабіць. Цяжкасці апошніх гадоў настолькі ўсю краіну і ўсіх жанчын згуртавалі і загартавалі — і, што б ні здарылася, крый божа, вядома, але БСЖ цяпер заўсёды будзе на передавой. На перадавой добрых і патрэбных ініцыятыў у нашай краіне».

Новаабраная **старшыня БСЖ Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** ў размове з журналістамі сказала: «Мы цяпер жывём у няпросты час, і далей працы не будзе. Таму наперадзе задач яшчэ больш. Але самая галоўная наша задача — быць апорай і падтрымкай для нашай краіны і кіраўніка дзяржавы».

**Паводле БелТА.**

# ФІНАНСАВЫ КУЛЬБІТ

## Еўра апусціўся да долара

**12 ліпеня адбылася не радавая падзея для заходніх валютных біржаў — курс еўра зраўняўся з курсам долара. Менавіта ў аўторак паміж курсамі гэтых валют утварыўся парытэт (1:1). Такіх суадносін дзвюх валют не было ўжо два дзесяцігоддзі.**

У апошні час еўра традыцыйна таргаваўся даражэй за амерыканскі долар. Выключэннем быў 2000 год, калі «амерыканец» каштаваў даражэй за еўра. У 2001 годзе еўра ўсё яшчэ саступаў долару ў цане, але да 2003 года еўрапейская валюта зноў стала таргавацца даражэй, чым амерыканская.

Фінансавыя аналітыкі мяркуюць, што курс еўра знізіўся да мінімуму за 20 гадоў на фоне ўзрастаючай боязі, што Расія можа спыніць пастаўкі газу ў Еўропу і ўвесці рэгіён у рэцэсію. Эксперты тлумачаць, што такое развіццё падзей абцяжарыць Еўрапейскаму цэнтральнаму банку ўзмацненне жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі. Акрамя таго, ключавы трубаправод «Паўночны паток» закрыты на тэхнічнае абслугоўванне з 11 да 21 ліпеня, і ёсць асцярогі, што пасля адкрыцця ён можа не выйсці на поўную магутнасць. Усё гэта ставіць пад пагрозу магчымасці запоўніць еўрапейскія газавыя сховішчы да наступлення зімы.

Усе гэтыя навіны і прывялі да сітуацыі, калі ў апошнія тыдні рынкі знізілі чаканні, што Еўрапейскі цэнтральны банк зможа досыць радыкальна ўзмацніць сваю палітыку і павысіць ключавыя стаўкі ў бягучым годзе.

Чакалася, што стаўкі могуць вырасці на 30—135 базісных пунктаў. Такая мера неабходная пры рэзка ўзрослай інфляцыі ў Еўрасаюзе, якая ўжо дасягнула новага рэкорднага ўзроўню ў 8,6 %.

Цяпер жа прагназуюць, што Еўрапейскі цэнтрабанк павысіць ключавыя стаўкі не больш чым на 25 пунктаў да канца ліпеня. І гэта стане першым павышэннем больш чым за 11 гадоў, у той час як Федэральная рэзервовая сістэма ЗША плануе павысіць базавую стаўку на 75 базісных пунктаў. Хутчэй за ўсё, гэта адбудзецца на чарговым пасяджэнні, якое запланавана на 27 ліпеня. Прычым з сакавіка Вашынгтон ужо павысіў стаўку на 150 пунктаў.

### ПЛАКАЦЬ ЦІ СМЯЯЦЦА?

Эксперты лічаць, што дадзеная сітуацыя можа быць выгадная еўрапейскім экспарцёрам і, адпаведна, беларускім імпарцёрам, якія дастаўляюць тавары з Еўропы і разлічваюцца ў еўра.

Для прадпрыемстваў і банкаў, у якіх ёсць крэдытная запазычанасць перад еўрапейскімі фінансавымі інстытутамі, не адбудзецца значнага павышэння ставак.

А вось для грамадзян Беларусі, у якіх ёсць зберажэнні ў еўра, гэта негатыўная сітуацыя. Але тут дзейнічае залатое правіла дыверсіфікацыі: захоўваць зберажэнні ў розных валютах. Такім чынам вы мінімалізуеце рызыкі падобных сітуацый. У сваю чаргу, плюсам для нашых грамадзян можа стаць тое, што еўрапейскую валюту за беларускія рублі цяпер купіць танней. Вось толькі пры паездках у ЕС наўрад ці гэта зможа кампенсаваць узрослыя цэны ў еўра: гэтае пытанне складанае і індывідуальнае для кожнай краіны еўразоны і групы тавараў. Тут справа ў тэмпе інфляцыі, росце цэн на спажывецкія тавары і паслугі ў Еўропе. Цяпер ён вельмі высокі.

**А з раніцы (12 ліпеня) на Беларускай валютна-фондавай біржы курс долара абваліўся на 0,0241 BYN да 2,6371 BYN / USD да мінімуму за 8 дзён. У гэты час курс еўра знізіўся адразу на 0,0522 BYN да 2,6391 BYN / EUR. Атрымліваецца, што і ў нас долар і еўра ацэньваюцца аднолькава — 2,63 нашага, айчыннага рубля.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

Дзеля памяці

# Па баявым шляху Дняпроўскай ваеннай флатыліі

**На Піншчыне ўчора быў праведзены водны паход па баявым шляху Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Мерапрыемства прысвячалася 78-й гадавіне вызвалення Пінскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Стартавалі экіпажы байдарак у вёсцы Пачапава. Удзельнікі воднага паходу прайшлі па баявым шляху бранякатара № 154 Дняпроўскай ваеннай флатыліі па рацэ Піна на месцы жорсткіх баёў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Як расказалі ў Пінскім райвыканкаме, вызваленне Пінскага раёна пачалося ў сакавіку 1944 года. Бітвы на асобных тэрыторыях працягваліся да 20 ліпеня. Асабліва жорсткія баі разгарнуліся на подступах да горада. Вызваленне савецкімі войскамі Пачапава стала адной з ключавых аперацый па вызваленні Пінска. У гэтай бітве 12 ліпеня БК-154 затануў, трапіўшы пад шквальны агонь ворага. Імёны пяці членаў экіпажа ўшанаваны на мемарыяле воінскай славы ў гарадскім парку.

Завяршыўся паход байдарачнікаў каля памятнага знака ў гонар бранякатара № 154 каля санаторыя «Ясельда». Там адбыўся мітынг з удзелам кіраўніцтва раёна, ветэранаў і грамадскасці. У памяць аб загінулых марaках і дэсантніках на ваду былі спушчаны вянок і кветкі.

# Камізэлькі, пінжакі, вадалазкі і нават бомберы...

**На сайце Міністэрства адукацыі размешчаны поўны каталог, які змяшчае элементы школьнай формы, паведаміў карэспандэнту БелТА міністр адукацыі Андрэй Іванец.**



Фота БелТА.

«На сайце Міністэрства адукацыі размешчаны поўны каталог, які ўключае элементы школьнай формы. Ён вельмі разнастайны: камізэлькі, пінжакі, вадалазкі, такія новыя, модныя элементы адзення, як бомберы, папулярныя ў падлеткаў. Гэта значыць — камплект, які можа быць выкарыстаны школай, дакладна рэгламентаваны каталогам. Да яго можа і павінен звярнуцца кожны дырэктар школы разам з бацькамі і навучэнцамі, каб выбраць не толькі той элемент, які яны хочуць увесці, але і колеравую гаму, якая таксама вельмі шырокая», — сказаў міністр.

Андрэй Іванец адзначыў, што Мінадукацыі па ўсёй краіне праводзіць анлайн-анкетаванне, каб даведацца формeнныя і колеравыя перавагі навучэнцаў у школьнай форме. «Кожная школа мае права вырашаць, які менавіта элемент яны абяруць. Больш за тое, для навучэнцаў пачатковых класаў гэта можа быць адзін адметны элемент, для навучэнцаў 5—9-х класаў — іншы, а для старшакласнікаў, навучэнцаў 10—11-х класаў, будучых нашых выпускнікоў, гэта можа быць трэці адметны элемент. Гэта будзе ствараць дадатковы матывацыйны стымул для школьнікаў станавіцца больш дарослымі, расці і набываць веды», — падкрэсліў ён.

Інфармацыю аб выбраным адметным элементе ўсе школы краіны дадуць праз галоўныя ўпраўленні адукацыі аблвыканкамаў да 1 жніўня.

# КАЛІ РАЗРАД МОЖА СТАЦЬ СМЯРОТНЫМ

## АХВЯРЫ СТЫХІІ

Летась у адзін з ліпеньскіх дзён трагедыя адбылася каля возера ў Стайках, што непадалёку ад Мінска. Кампанія маладых людзей адпачывала каля вадаёма. Раптам пачалася навальніца. Моладзь не прыдумала нічога лепшага, як схавацца пад вялізным разгалістым дубам. А як вядома нам яшчэ з дзяцінства, хавацца падчас навальніцы пад дрэвам катэгарычна забараняецца: маланка вельмі часта сюды трапляе. Асабліва электрычны зарад прыцягваюць высокія і магутныя дрэвы — акурат такія, як дуб.

У гэтай сітуацыі менавіта так і адбылося. Ад удару маланкі ў дрэва дзяўчына 1996 года нараджэння загінула на месцы. Чатыры маладыя чалавекі атрымалі моцныя электратраўмы. Мінскія ўрачы зрабілі ўсё магчымае, каб захаваць здароўе маладым людзям.

Два гады таму ад удару маланкі загінуў 82-гадовы жыхар Мёрскага раёна. Следчыя высветлілі, што пенсіянер каля свайго дачнага ўчастка вёў у руках веласіпед, што падчас навальніцы забараняецца.

Навальнічны разрад маланкі можа стаць і прычынай пажару. Аднак гэта бывае нячаста. У маі ў пасёлку Чырвоная Даліна, што ў Салігорскім раёне, агнём быў знішчаны дах і пашкоджана перакрыцце жылога дома. На момант пажару ўнутры знаходзіўся мужчына. Калі ў хаце знікла электрычнасць і ў адным з пакояў пачала чарнець столь, гаспадар выйшаў на вуліцу. Аднак ратавальнікаў можна было ўжо не выклікаць — мужчыну апярэдзілі суседзі.

У гаспадарчую пабудову трапіла маланка і ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна. Аб узгаранні ў МНС паведаміла жанчына, якая з'яўлялася суседкай гаспадароў пабудовы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пад пагрозай знаходзілася і іх хата, аднак ратавальнікі, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, там пажару не дапусцілі.

## ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН

Калі непагадзь застала вас на вуліцы, пакіньце адкрытую прастору і схавайцеся ў памяшканні або ў пад'ездзе любога дома. Вырашылі перачакаць пад казырком будынка — не дакранайцеся да сцяны. Не карыстайцеся падчас навальніцы мабільным тэлефонам. Не стойце паблізу высокіх слупоў, рэкламных шчытоў. Нельга бегаць, ездзіць на веласіпедзе, мапедзе, матацыкле і роліках.

— Першае і самае галоўнае — варта пазбягаць дрэў і хісткіх будынкаў: моцны вецер без цяжкасцяў можа іх паваліць, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ**. — Таксама ёсць высокая рызыка пацярпець ад дрэва, якое ўпала, або апынуцца пад абломкамі будынка. Ёсць і іншыя збудаванні, якія могуць складаць пагрозу падчас непагадзі. У прыватнасці, лініі электраперадачы, якія могуць быць сарваныя ветрам. Ад трубаправодаў, мастоў і эстакад таксама варта трымацца далей.

Калі непагадзь застала вас дома, гэта не азначае, што можна расслабіцца. Пры моцным, шквалістым ветры варта зачыніць вокны. Адключыце ўсе электрапрыборы і выцягніце штэкер вонкавай антэны з тэлевізара, спыніце тэлефонныя размовы. Паспрабуйце ліквідаваць скразнякі, шчыльна зачыніце вокны і коміны. Не размяшчайцеся каля акна, печы, масіўных металічных прадметаў, на даху і паддашку, не датыкайцеся да прыбораў ацяплення. Таксама не рэкамендуецца ў час навальніцы прымаць ванну ці душ, мыць посуд.

Калі ж з непагаддзю сутыкнуліся, едучы на аўтамабілі, рух неабходна спыніць. Зачыніце ў машыне вокны, апусціце антэну, заглушыце рухавік і перачакайце навальніцу ў салоне. Важна не дакранацца да ручак дзвярэй і іншых металічных прадметаў. Не варта браць у рукі і мабільны тэлефон. Ратавальнікі рэкамендуюць падчас непагадзі паркаваць машыну далёка ад дрэў і збудаванняў, якія падчас моцнага ветру могуць пашкодзіць аўтатранспарт.

Так здарылася, што навальніца заспела вас у лесе і дахаты вяртацца далёка? Паспрабуйце трымацца падалей ад высокіх дрэў, якія стаяць асобна. Часцей за ўсё маланка трапляе ў дубы, таполі і вязы, радзей — у бярозы і клёны. Уладкуйцеся паміж нізкарослымі дрэвамі з густымі кронамі. Выбіраючы сабе ўкрыццё, звярніце ўвагу, каб побач не было расколатых дрэў, раней пашкоджаных навальніцай: маланка сюды можа трапіць яшчэ раз. Нельга знаходзіцца і каля вогнішча: слуп гарачага паветра — добры праваднік электрычнасці.

— Не стойце на ўзвышшах, каля апор ліній электраперадачы і пад правадамі, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Будучы ў чыстым полі, пашукайце яму або яр. Калі ніякіх заглыбленняў паблізу няма, прысядзьце як мага ніжэй ці ляжце на зямлю. Не хавайцеся ў стозе сена ці саломы, у закінутых адзіночных бараках ці хлявах. Не хадзіце басанож і не падымайце над галавой прадметы, якія праводзяць ток: рыдлёўкі, матыкі, косы.

Знаходзячыся падчас навальніцы на вадаёме, трэба выйсці з вады, адысці падалей ад берага і схавацца ва ўкрыцці. Тым, хто плыве ў лодцы, ратавальнікі раяць веславаць да берага. Калі гэта немагчыма, лодку патрэбна абсушыць. Пры наяўнасці ахоўнага тэнта неабходна яго падняць. Калі ёсць сухое адзенне, лепш пераадзецца. Затым варта сесці падалей ад мачтаў і падкласці пад сябе выратавальную камізэльку або боты. Рыбалку падчас навальніцы неабходна спыніць: снасці з'яўляюцца правадніком для электрычнасці.

Лепш за ўсё, калі бачыце, што ідзе навальніца, застацца дома. «Каб зразумець, набліжаецца навальнічны фронт ці аддаляецца, трэба засекчы час паміж водбліскамі маланкі і грукатам, — рэкамендуе Яўген Бараноўскі. — За тры секунды гук праходзіць адлегласць у адзін кіламетр. Калі час ад успышкі маланкі да грому пачынае памяншацца, значыць, навальніца набліжаецца. Такім чынам можна различыць прыблізную адлегласць да эпіцэнтра навальніцы і засцерагчы сябе. Самая вялікая небяспека ўзнікае тады, калі адразу за водбліскам маланкі гучыць гром — гэта значыць, навальнічнае воблака знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці».

**Вераніка КАНЮТА.**

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЎДАРЫЛА МАЛАНКА:

- хутка вызначце стан пацярпелага;
- неадкладна правядзіце рэанімацыйныя мерапрыемствы: штучнае дыханне, непрамы масаж сэрца;
- сагрэйце пацярпелага;
- апрацуйце месцы апёкаў і спадарожныя раны;
- дайце анальгін;
- тэрмінова дастаўце пацярпелага ў бальніцу.

---

Камунальныя стасункі

# ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ АДХОДЫ НА 100 ПРАЦЭНТАЎ



## Што для гэтага патрэбна?

**Штогод у Беларусі ствараецца каля 4 млн тон камунальных адходаў (6-7 % ад агульнай колькасці смецця ў краіне), з якіх здабываецца толькі 25 % другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР). Каб палепшыць сітуацыю і наблізіцца да 100-працэнтнага выкарыстання смецця ў краіне, плануецца не толькі здабываць з яго другасныя рэсурсы, але і вырабляць паліва для цэментных заводаў, а таксама кампаставаць арганічную частку камунальных адходаў. Што будзе адбывацца ў «смеццевай» сферы ў найбліжэйшы час і што перашкаджае зменам, расказалі спецыялісты.**



### ТРАЦІНА ЗДАБЫВАЕЦЦА, ДЗВЕ ТРАЦІНЫ — ЗАКОПВАЮЦЦА

Больш за 80 % камунальнага смецця — адходы спажывання, якія ствараюцца ў насельніцтва. Астатняя частка — адходы вытворчасці, якія ўтвараюцца на аб'ектах забеспячэння жыццядзейнасці чалавека, дадала эксперт. Згодна з нацыянальнай стратэгіяй па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і ДМР, айчынныя здабыткі трэба спалучаць з найлепшымі сусветнымі дасягненнямі, якія даказалі сваю бяспечнасць і эфектыўнасць, падкрэсліла **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Міністэрства ЖКГ.**

Выкарыстанне камунальных адходаў цяпер абмяжоўваецца ў асноўным здабываннем з іх складу другасных рэсурсаў шляхам выкідання ў кантэйнеры, здачы ў прыёмныя пункты, сарціроўкі на смеццеперапрацоўчых заводах. Аднак пры такім стане спраў можна задзейнічаць прыкладна трэціну адходаў, заўважыла яна і абазначыла асноўныя праблемы існуючай сістэмы абыходжання з адходамі:

— Недастатковая тэхнічная аснашчанасць у галіне існуючых магутнасцяў па сарціроўцы і раздзельным зборы фактычна дазваляе сартаваць толькі трэцюю частку адходаў. Астатняе хаваецца без папярэдняй сарціроўкі. Эксплуатуецца значная колькасць палігонаў для захавання, якія не адпавядаюць сучасным прыродаахоўным патрабаванням. Адсутнічаюць аб'екты энергетычнага выкарыстання, апрацоўкі і выкарыстання іх арганічнай часткі (выключэнне — адходы драўніны). Недастатковая эканамічных стымулаў для развіцця вытворчасцяў па паглыбленай перапрацоўцы адходаў, паколькі можна больш танна іх захаваць на палігоне.

### АД РАЁННАГА ДА РЭГІЯНАЛЬНАГА

Чакаецца, што сёлета паказчык збору другасных рэсурсаў у краіне падрасце да 27 % (ужо назапашана больш за 600 тысяч другасных рэсурсаў), а ў 2025-м — да 64 %. А вось амбіцыйны план выкарыстоўваць у 2035 годзе да 90 % камунальных адходаў можна выканаць, калі здабываць з іх усе прыдатныя для другаснага выкарыстання рэсурсы (29 % ад усяго аб'ёму адходаў). 61 % адходаў можна ўцягнуць у апрацоўку за кошт укаранення новых для краіны тэхналогій, у прыватнасці, кампаставання арганічнай часткі смецця (23 %) і выкарыстання цеплатворнай фракцыі (38 %), абазначыла Наталля Грынцэвіч:

— Нацыянальная стратэгія прадугледжвае мадэрнізацыю сістэмы абыходжання з адходамі на аснове пераходу ад раённай сістэмы кіравання адходамі на рэгіянальны ўзровень і стварэння 30 буйных комплексных аб'ектаў па сарціроўцы і выкарыстанні камунальных адходаў, якія будуць абслугоўваць тры-шэсць раёнаў.

Гэта дазволіць павялічыць узровень выкарыстання смецця на 6 % — за кошт здабывання другасных рэсурсаў, на 23 % — за кошт вытворчасці паліва для цэментнай прамысловасці, на 18 % — за кошт выкарыстання арганічнай часткі адходаў для добраўпарадкавання і рэкультывацыі тэрыторый, на 3 % — за кошт стварэння дэпазітнай сістэмы збору спажывецкай упакоўкі, 15 % — за кошт выкарыстання змешаных адходаў для атрымання цепла- і электраэнергіі на аб'ектах у сталіцы. А для захавання непрыдатнай да выкарыстання часткі адходаў прадугледжана стварэнне сучасных рэгіянальных палігонаў.

У выніку плануецца аддаць на перапрацоўку да 970 тысяч тон ДМР у 2025 годзе і 1085 тон — у 2035-м. Мяркуецца таксама ствараць і выкарыстаць каля 235 тысяч тон РДФ-паліва ў 2025 годзе і 585 тысяч тон — у 2035-м. Павялічыць выкарыстанне арганічнай часткі адходаў да 354 тысяч тон у 2025-м і да 535 тысяч тон — у 2035-м. А яшчэ выкарыстоўваць да 550 тысяч тон змешаных камунальных адходаў на аб'ектах энергетыкі.

### ЭКАНОМІКА ЗАМКНЁНАГА ЦЫКЛА ПА-БЕЛАРУСКУ

Айчынная нацыянальная стратэгія забяспечвае фарміраванне і развіццё такіх складнікаў эканомікі замкнёнага цыкла, як збор і перапрацоўка другаснай сыравіны, выкарыстанне адходаў у якасці крыніцы энергіі. Разам з тым, у краіне недастаткова прапрацаваны меры нарматыўна-прававога рэгулявання, якія забяспечваюць фарміраванне эканомікі замкнёнага цыкла: вытворчасць, пераразмеркаванне і спажыванне тавару, адзначыла спецыяліст:

— Эканоміка замкнёнага цыкла заклікана змяніць класічную мадэль «стварыць-выкарыстаць-выкінуць» на мадэль, якая базіруецца не на здабычы рэсурсаў, а на іх аднаўленні, перапрацоўцы другаснай сыравіны і пераходзе ад выкапнёвых рэсурсаў да аднаўляльных крыніц энергіі. Гэта дазволіць мінімізаваць як здабычу рэсурсаў, так і стварэнне адходаў.

Паказчыкі эканомікі замкнёнага цыкла Еўрапейскай камісіяй прапануюцца для чатырох сфер. Для вытворчасці і спажывання гэта самазабеспячэнне сыравінай, развіццё зялёных дзяржзакупак, зніжэнне аб'ёмаў утварэння адходаў, рэгуляванне абыходжання з харчовымі адходамі. У сферы кіравання адходамі плануюцца паказчыкі ўзроўню іх выкарыстання ў цэлым і асобна па відах. У сферы абыходжання з другаснай сыравінай — паказчык па яго долі ў агульным попыце. У сферы канкурэнтаздольнасці і навацый — інвестыцыі, занятасць, валавы дадатковы кошт у сектары эканомікі замкнёнага цыкла, колькасць патэнтаў у галіне перапрацоўкі ДМР.

— У Беларусі ў сферы вытворчасці прадуктаў неабходна заканадаўча замацаваць прынцыпы прадухілення стварэння адходаў, кіравання адходамі як рэсурсам, а таксама вызначыць паўнамоцтвы органаў дзяржкіравання, адказных за іх рэалізацыю, — упэўненая дырэктар Аператара ДМР. — Гэта дазволіць на нацыянальным узроўні вызначыць разгорнутыя мэтавыя паказчыкі выкарыстання адходаў і другаснай сыравіны і тэрміны іх дасягнення. Уводзіць забарону аб абмежаванне на вытворчасць, імпарт і рэалізацыю пэўных відаў тавараў і выкарыстанне шкодных рэчываў і матэрыялаў, непрыдатных да перапрацоўкі.

Неабходна таксама ўводзіць патрабаванні па абавязковым выкарыстанні другаснай сыравіны пры вытворчасці тавараў, работ, паслуг, матэрыялаў з магчымасцю шматразовай перапрацоўкі. Арганізоўваць вытворчасць прадукцыі з улікам магчымасцяў яе наступнага паўторнага выкарыстання або прадаўжэння тэрміну службы вырабу. Эканамічна стымуляваць вытворчасць тавараў, якія адпавядаюць прынцыпам эканомікі замкнёнага цыкла. А з іншага боку, магчыма павышаць падаткі на захаванне адходаў. Усе гэтыя прапановы трэба максімальна ўлічыць пры комплекснай карэкціроўцы Закона аб абыходжанні з адходамі, рэзюмавалі эксперты.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# Рэгіёны чакаюць гасцей




## БРЭСТЧЫНА

Штогод рэгіён папаўняецца новымі экскурсіямі і турыстычнымі праектамі. Па-ранейшаму застаюцца папулярнымі маршруты, пракладзеныя да Брэсцкай крэпасці і Белавежскай пушчы. Але трэба адзначыць, што ў вобласці актыўна развіваюцца культурны, экалагічны, гастранамічны турызм. Наогул распрацавана тры сотні маршрутаў! У Бярозаўскім раёне на базе біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння «Спораўскі» адкрылася экалагічная сцежка «У краі вяртлявай чаротаўкі». Канструкцыя сцежкі ўнікальная — па ёй можна праехаць на веласіпедзе. Яна абсталявана і для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

З 2021 года пачалася рэалізацыя пілотнага праекта «Турыстычны рэгіён «Прыпяцкае Палессе». Ствараецца сістэма турыстычных інфармацыйных цэнтраў, якія дапамагаюць гасцям зарыентавацца і падабраць пад сябе маршрут. Сёння на Брэстчыне іх ужо паўтара дзясятка. У межах пілотнага праекта створаны агратурыстычны кластар у Пінскім раёне, які налічвае звыш 20 удзельнікаў.

Косаўскі палацава-паркавы комплекс з рэстаранам і гасцініцай можа ператварыцца ў адно з найбольш запатрабаваных месцаў. Напрыклад, за мінулы год яго наведала 98 тысяч чалавек, і гэтыя лічбы працягваюць расці. У палацы вядуцца рэстаўрацыйныя работы, будуць ствараца новыя выставачныя і экспазіцыйныя залы.

Летась завершаны работы па аднаўленні родавага маёнтка Напалеона Орды ва ўрочышчы Чырвоны Бор Іванаўскага раёна.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Брэсцкая вобласць — адзіны рэгіён у краіне, дзе на дадзены момант рэалізоўваюцца інвестыцыйныя праекты ў галіне турызму. Вядзецца будаўніцтва экабазы ў Баранавіцкім раёне і турыстычнага комплексу ў вёсцы Вялікія Косічы.

У Драгічынскім раёне распрацаваны маршрут для сплаву на байдарках «Буг аб'ядноўвае нас» працягласцю 100 км. Засталося толькі ўстанавіць знакі турыстычнай навігацыі па ходзе маршруту.

Каб прыцягнуць увагу да малых гарадоў, пачалі распрацоўваць новыя IT-прадукты. Адзін з прыкладаў — праект «Пазнай Кобрын», які паказвае турыстычныя магчымасці рэгіёна. Дзякуючы дадзенаму праекту можна віртуальна і рэальна падарожнічаць па горадзе і ваколіцах. Замест экскурсавода пра культурныя і гістарычныя месцы ў горадзе распавядзе «галасавы памочнік».

## ВІЦЕБШЧЫНА

У вобласці актыўна развіваецца экалагічны турызм. Што не дзіўна: тут знаходзіцца самая вялікая колькасць азёраў у краіне, для тэрыторыі характэрная высокая лясістасць. Госці з задавальненнем едуць у Бярэзінскі біясферны запаведнік і Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры».

На тэрыторыі Браслава працуе парусная школа. Закуплена 10 яхтаў. Тут арганізуюць цімбілдынг на вадзе на лодках класа «Дракон». Гэта плавальныя сродкі ўмяшчальнасцю да 20 чалавек, дзе размяшчаецца барабаншчык, які задае тэмп веслярам.

Актыўна пракладваюцца экасцежкі, у тым ліку праз адзінае ў Еўропе вярховае балота, якое знаходзіцца на тэрыторыі дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Ельня».

Віцебшчына — фестывальны рэгіён. Акрамя «Славянскага базару», можна завітаць на міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы» ў Дуброўне. Полацк збірае аматараў арганнай музыкі на «Званы Сафіі». На Мёршчыне праводзіцца экалагічнае свята «Журавы і журавіны», у Глыбокім — Вішнёвы фестываль.

На Пастаўшчыну на базу турыстычнага комплексу «Азёркі» вярнуўся Зюзя Паазерскі (беларускі Дзед Мароз). Тут будуецца гасцінічны комплекс.

## ГОМЕЛЬШЧЫНА

У вобласці актыўна развіваецца праект «Патрыятычны імпульс». Уключаныя ў яго маршруты наведала ўжо больш за 11 тысяч чалавек. Навінка гэтага года — аб'ект «Партызанская крынічка». Тут аднаўлены мемарыялы, з'явіліся акопы, бліндажы, зямлянкі (кожная тэматычная, з зямлянкі штабной да харчовай, дзе можна пакаштаваць стравы салдацкай кухні). З месцам звязана паданне. Маўляў, чалавек, які адсюль пап'е вады, будзе жыць, пакуль існуе крынічка. Першых экскурсантаў тут прынялі 22 чэрвеня.

Сямнаццаць гадоў у вобласці чакалі адкрыцця музея на месцы археалагічнага комплексу ў Юравічах. У верасні мінулага года музей-стаянка першабытнага чалавека нарэшце пачаў функцыянаваць. Яго прэзентуюць на розных турыстычных выстаўках, а колькасць турыстаў, якія выбудоўваюць свае падарожжы праз аграгарадок Юравічы Калінкавіцкага раёна, імкліва расце, сацсеткі напаўняюцца эфектнымі здымкамі. Мясцовы старажытны манастыр таксама прыцягвае ўвагу турыстаў.

У жніўні Гомельшчына будзе прымаць гасцей на адным з самых яскравых фестываляў «Кліч Палесся», дзе працуюць падворкі, музеі, рамеснікі, ладзяцца гулянні з песнямі і танцамі.

## ГРОДЗЕНШЧЫНА

Тут распрацаваны новыя маршруты экалагічнай, рэлігійнай і культурна-пазнавальнай тэматыкі. За апошні час з'явіліся тры новыя маршруты па Ваўкавыскім, Навагрудскім, Свіслацкім, Берасціцкім раёнах і пяць водных маршрутаў па рэках і азёрах Астравецкага, Смаргонскага і Гродзенскага раёнаў. Дарэчы, на Гродзеншчыне створана ўжо больш за 280 маршрутаў.

Для адпачынку задзейнічаны ахоўныя прыродныя тэрыторыі. У межах вобласці знаходзяцца Белавежская і Налібоцкая пушчы, 15 заказнікаў рэспубліканскага значэння. Тут абсталяваны дзясяткі цікавых экалагічных сцежак і маршрутаў. Адны можна прайсці пешшу, другія — пераадолець на веласіпедзе, конях ці аўто, трэція — праплысць на маторным катары, лодцы ці байдарцы. Сярод навінак сезона — маршрут «Дакрананне да прыроды» на тэрыторыі заказніка «Азёры» ў Гродзенскім раёне, які ўключае ў сябе падарожжа па вузкакалейнай чыгунцы на экалагічных відах транспарту: веладрызіне і электрычнай мотадрызіне. У дадзены момант у стадыі распрацоўкі знаходзіцца мабільны дадатак «Турыстычны гід па заказніку».



Сёлета турыстам прапануюць адпачынак на тэрыторыі Нацпарка «Белавежская пушча» з боку Гродзенскай вобласці з арганізацыяй сафары-тураў, экстрым-тураў па бездарожжы на пазадарожніку ў аграсядзібе «Белавежскі кут».

Набіраюць папулярнасць экскурсіі на дзеючыя вытворчасці. Яны праводзяцца на прадпрыемствах харчовай, шкляной, лёгкай прамысловасці.

У праграму турмаршрутаў уключаюцца элементы шоу, анімацыя, дэгустацыя, візуалізацыя, майстар-класы і тэматычныя праграмы.

Культурныя мерапрыемствы часта праводзяцца паблізу ад турыстычных аб'ектаў і аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Сярод тых, якія палюбіліся турыстам, — «Замкавы гасцінец» у Лідскім раёне, «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў», «Ганненскі кірмаш» у Зэльве, «Гальшанскі замак», «Іўеўскія памідоры», «Сыр, хлеб, квас і добры настрой» у Навагрудку. Ёсць і новыя фестывалі: «Бацькава булка» ў Свіслачы і «Паўлаўскі каравай» на Слонімшчыне, рыцарскі фэст «Меч Кейстута» ў Смаргонскім раёне і музычны фестываль Sound Live ў Ваўкавыску.

Адкрываюцца пасля рэстаўрацыйных работ аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, новыя музеі і галерэі. Калі летась значнымі падзеямі былі рэканструкцыя Старога замка ў Гродне, адкрыццё музейных экспазіцый у Гальшанскім і Крэўскім замках, то сярод навінак гэтага года — адкрыццё ўнікальнага па сваіх інтэрактыўнасцях музея Лідскага бровара і галерэі халоднай парадной зброі «Арсенал» у Гродне.

Прырастае інфраструктура. За мінулы год і першую палову бягучага ў Гродне адкрыліся 22 новыя аб'екты грамадскага харчавання і тры аб'екты пражывання на 60 месцаў.

## МАГІЛЁЎШЧЫНА

У Магілёўскай вобласці больш запатрабаваныя такія кірункі, як культурна-пазнавальны, аздараўленчы. Турыстычнымі арганізацыямі горада распрацавана пад сотню маршрутаў, якія могуць доўжыцца 1—8 дзён. Яны могуць быць розныя па спосабах перамяшчэння: аўтобусныя, пешаходныя, веласіпедныя і водныя. З'яўляюцца новыя турпрадукты: база адпачынку «Кедравы бор» стала месцам начлегу для ўдзельнікаў байдарачных паходаў па Дняпры, гатэль «Атрыум» прапануе спатуры з экскурсійнай праграмай. У Магілёве запрацаваў хостэл, які спецыялізуецца на прыёме школьных груп. Арганічна ўліваюцца ў турыстычныя маршруты сядзібы, што прапануюць самабытныя праграмы. Сядзіба «Пчалінае царства» мае музей вясковага быту, а ў «Сырнай даліне» гасцей чакаюць экскурсіі і майстар-класы. Магілёўскі драматычны тэатр запрашае турыстаў у закуліссе і знаёміць з сакрэтамі тэатральнага жыцця. Магілёўскі вінзавод можа правесці дэгустацыю магілёўскіх навінак, прадпрыемства «Дамачай» — вытворчую экскурсію з майстар-класам, універсітэт харчавання ладзіць прафарыентацыйныя сустрэчы і вучыць гатаваць дранікі.

Новыя атракцыі — рэканструкцыя партызанскага лагера «Усакіна», квэст-праграма ў Бабруйскай крэпасці «Форт Бобр Ярд», якая ўражвае дэкарацыямі і прыгодамі, з прыцягненнем акцёраў драматычнага тэатра. Можна паўдзельнічаць у квэст-шоу «Легенды Магілёва» ці праграме «Тайны Блакітнай крыніцы» ў Слаўгарадскім раёне з наведваннем вёскі Лясная.

Канікулы

# Дзе адпачываюць дзеці?

**Больш за 650 лагераў розных тыпаў гэтым летам прымае на аздараўленне сталічных школьнікаў. Трэба сказаць, што сёлета асаблівы попыт на дзіцячы адпачынак. Ужо ў сакавіку—красавіку ў большасці летнікаў месцы былі забраніраваны.**

Як паведаміў **кіраўнік прадстаўніцтва Мінскага гарадскога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Валерый НАФРАНОВІЧ**, ва ўсіх лагерах плануецца аздаравіць у летні перыяд каля 63 з паловай тысячы дзяцей. Больш за 60 працэнтаў з іх накіруецца за межы сталіцы ў аздараўленчыя ўстановы з кругласутачным знаходжаннем.

За змену 31 загарадны летнік здольны прыняць каля васьмі з паловай тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак. Наогул за час канікул такім чынам аздаровіцца больш за 30 тысяч дзяцей. Гэта стала магчыма дзякуючы таму, што дарослыя паклапаціліся пра захаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы летнікаў. На працягу чатырох гадоў на яе падтрымку выдзяляліся паўтара мільёна рублёў. Сёлета ўласнікі са сваіх сродкаў выдаткавалі яшчэ 5 мільёнаў на стварэнне камфартабельных і годных умоў для адпачынку юных беларусаў. На памяншэнне кошту пуцёвак гарадскім упраўленнем цэнтра па санаторна-курортным лячэнні будзе накіравана каля 11 мільёнаў рублёў.

Месцаў для загараднага адпачынку стала больш. Пасля рэканструкцыі адкрыўся аздараўленчы лагер «Агеньчык» у Ждановічах. Пачаў прымаць дзяцей лагер «На ростанях», які тры гады не функцыянаваў. У апошнім пераважна будуць адпачываць юныя спартсмены. Тут пабудаваны стадыён, валейбольная і баскетбольная пляцоўкі.

Сёлета адбылося далучэнне аздараўленчага лагера «Купалінка» да лагера «Гарызонт». Як вынік: у краіне з'явілася ўнікальная база, здольная прыняць за змену 1600 дзяцей. Кожны заезд школьнікаў — эфектная падзея, уявіце: сюды адначасова кіруецца больш за 36 аўтобусаў.

Сёлета летнікі прымаюць дзятву не толькі ў 3-4 змены, многія з іх працуюць у пяцізменным рэжыме.

Некаторыя дзеці падчас канікулаў выбіраюць у профільныя лагеры. Лідзіруюць спартыўна-аздараўленчыя заезды (за лета плануецца прыняць каля 11 тысяч юных спартсменаў).

Развіваецца ваенна-патрыятычны кірунак. Ужо дзявяты год лагер «Патрыёт» збірае падлеткаў, якія патрабуюць асаблівай сацыяльна-педагагічнай увагі.

Будзе арганізавана больш за 90 летнікаў працы і адпачынку. На кантролі цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні — арганізацыя адпачынку сацыяльна неабароненай катэгорыі дзяцей. За лета плануецца аздаравіць каля 1400 сірот і каля тысячы дзяцей-інвалідаў.

Традыцыйным становіцца аздараўленне дзяцей у суправаджэнні аднаго з бацькоў, прычым гэты кірунак аплачваецца цалкам з гарадскога бюджэту.

Сёлета на базу аздараўленчага цэнтра «Энергетык» у чатыры змены заязджаюць малыя з цукровым дыябетам. На базе санаторыя «Зялёны бор» чакаюць пацыентаў з паталогіямі сэрца.

Ва ўзаемадзеянні з Беларускім Чырвоным Крыжам на базе лагера «Гарызонт» у пятую змену плануецца аздаравіць дзетак, якія прыедуць з Данецкай і Луганскай народных рэспублік. Адпачынак будзе аплачаны за кошт спонсара.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# СПРАВЫ САРДЭЧНЫЯ

## Што варта рабіць, каб «матор» не сапсаваўся?

**Сардэчна-сасудзістыя захворванні па-ранейшаму з'яўляюцца асноўнай прычынай смерці ў свеце. За апошнія дзесяцігоддзі дасягнуты істотныя поспехі ў лячэнні іх вострых і хранічных формаў, пацыенты выжываюць пасля інфарктаў і інсультаў, добрыя вынікі дае хірургічнае лячэнне. Аднак усе мы часта недаацэньваем значнасць прафілактыкі. Таму нават у паспяхова прааперыраваных пацыентаў з-за невыканання рэкамендацый вынікі не захоўваюцца доўга. А ў здаровых людзей з-за няправільнага харчавання, злоўжывання тытунём і адсутнасці дастатковай фізічнай нагрузкі сардэчна-сасудзістыя захворванні з'яўляюцца значна раней, чым маглі б.**

**Якія памылкі мы робім у штодзённым жыцці? Што зношвае нашу сардэчна-сасудзістую сістэму? Чым небяспечны бескантрольны прыём вітамінаў, якім многія захапіліся, перанёсшы каранавірусную інфекцыю? Як своечасова заўважыць сімптомы інфаркту? Пра гэта расказала загадчыца лабараторыі хранічнай ішэмічнай хваробы сэрца Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія», доктар медыцынскіх навук Вольга СУДЖАЕВА.**

### АДТЭРМІНАВАЦЬ НАСТУПЛЕННЕ ХВАРОБЫ

— Прафілактыка мусіць пачынацца не ў тых, хто ўжо захварэў, а ў абсалютна здаровых людзей. Важна як мага даўжэй працягнуць час да наступлення сардэчна-сасудзістых хвароб. З самага ранняга ўзросту, калі закладваюцца харчовыя і паводзінскія звычкі, варта пачынаць прафілактычныя мерапрыемствы, — адзначае суразмоўніца. — Сёння яны не носяць ультыматыўны характар: калі раней мы казалі пра дыету і павышэнне фізічнай актыўнасці, то цяпер — пра здаровае харчаванне і рацыянальную фізічную нагрузку. Як вельмі нізкая фізічная актыўнасць шкодная ў аддаленым перыядзе, так і празмерна інтэнсіўная. Калі здаровы чалавек не займаўся гэтым раней, варта звяртацца да ўрача, які падбярэ нагрузку па індывідуальным узроўні трэніраванасці, полу і ўзросце. Карысць будзе толькі тады, калі фізічная нагрузка дастаткова інтэнсіўная, але не настолькі, каб прыводзіць да вычарпання фізічных рэсурсаў.

Сур'ёзны напрамак прафілактыкі — адмова ад ужывання тытуню ў любым выглядзе. Сёння, нягледзячы на сучасныя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў гэтай галіне, ёсць адна рэкамендацыя — пазбягаць тытуню.

Важны кантроль за артэрыяльным ціскам і дысліпідэміяй — яны набылі актуальнасць асабліва пасля каранавіруснай інфекцыі. На жаль, ковід пакінуў негатыўныя наступствы. У тых, хто перанёс інфекцыю, можа назірацца дэстабілізацыя першапачаткова добра адрэгуляванага медыкаментозна артэрыяльнага ціску, развіваецца артэрыяльная гіпертэнзія. Таму кантроль ціску набывае ўсё большую значнасць.

Прыхільнасць да тэрапіі ў беларусаў, заўважае ўрач, па-ранейшаму застаецца нізкай. Калі прааналізаваць даныя STEPS за 2008 і 2018 гады, яна знізілася ў два разы. Пры гэтым адтэрмінаваць наступленне сардэчна-сасудзістых захворванняў можна, шмат у чым гэта ў руках кожнага з нас. І калі доктар дае рэкамендацыі, гэта не плён яго фантазій або асабістых назіранняў, а адпрацаваныя і старанна вывучаныя стратэгіі, якія сапраўды бяспечныя.

### ЯК НЕ ПРАПУСЦІЦЬ САРДЭЧНЫ ПРЫСТУП?

Інфаркт міякарда і іншыя праблемы з сэрцам вельмі каварныя, пры тым, што ў большасці пацыентаў маюцца тыповыя сімптомы.

— Калі мы кажам пра інфаркт міякарда, то гэта боль за грудзінай, які давіць і сціскае. Ён адчуваецца ў левай палавіне грудной клеткі, можа аддаваць у левую руку ці верхнюю частку жывата, у міжлапатачную зону, і гэта суправаджаецца вельмі дрэнным самаадчуваннем. Калі сімптомы ўзніклі ўпершыню, асабліва пасля фізічных ці псіхаэмацыянальных нагрузак, спалучаюцца з агульным дрэнным самаадчуваннем і рэзка выражанай слабасцю, потам ці дрыжыкамі, пацямненнем у вачах, гэта павінна насцярожыць. Калі маецца востры недахоп паветра, гэта таксама можа быць як прыкметай інфаркту, так і іншых жыццепагражальных станаў, — звяртае ўвагу Вольга Суджаева.

Калі такі стан у вас упершыню і ён пагаршаецца, доўга чакаць не трэба. На жаль, медыкі часта маюць справу з познім паступленнем пацыентаў у стацыянар, прычым і ў Мінску, і ў рэгіёнах.

— На жаль, калі такі стан развіваецца, чалавек імкнецца прылегчы, прыняць народныя сродкі, паставіць банкі, гарчычнікі, зрабіць масаж. Гэта замаруджвае аказанне спецыялізаванай дапамогі. Тут трэба ўсведамляць, што калі мы пачынаем лячэнне ў першыя гадзіны ад моманту развіцця захворвання, усё ідзе больш спрыяльна, чым калі час упушчаны.

### ВІТАМІНЫ: КАРЫСЦЬ ДЛЯ СЭРЦА ЦІ ШКОДА?

Адразу адзначым, што бескантрольны прыём лекавых доз вітамінаў D, A, E, прэпарату «Амега-3» можа сур'ёзна нашкодзіць здароўю. Вітамін D выпускаюць і рэалізоўваюць у аптэках не толькі ў прафілактычнай, але і ў лекавай дазіроўцы. І прызначаць самому сабе гэты прэпарат, што ўвайшло ў моду ў пандэмію ковід-інфекцыі і пасля, катэгарычна нельга. Лекавая дазіроўка вітаміну D у здаровага чалавека можа вельмі хутка выклікаць гіпервітаміноз (празмернасць вітаміну), які куды больш небяспечны, чым гіпавітаміноз (недахоп).



Таму прымаць такі прэпарат трэба толькі па прызначэнні ўрача. Рэкамендацыя датычыцца не толькі вітаміну D, але і тлушчараставральных вітамінаў A, E, групы B.

Ёсць наступствы і ў некантраляванага ўрачом прыёму прэпарату «Амега-3» — гэта поліненасычаныя тлустыя кіслоты. Тут гаворка ідзе менавіта пра лекі, якія з'явіліся ў 2008—2010-х гадах і на іх ускладаліся вялікія надзеі адносна насычэння арганізма добрым халестэрынам і прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў. Сёння ўрачы прызначаюць гэты прэпарат толькі для пэўнай катэгорыі пацыентаў, для якіх ён будзе гарантавана бяспечны.

— На жаль, некантраляванае спажыванне самога «Амега-3» і харчовых дабавак з «амега-3» (а там ёсць і амега-6, і амега-9, і амега-12) прывяло да павелічэння колькасці мігальных арытмій у тых, хто раней не меў хваробы сэрца і сасудаў, — заўважае Вольга Суджаева. — Папулярнасць лекавага сродку «Амега-3» з усімі наступствамі ўзрасла ў пандэмію каранавіруса. Гэты прэпарат прызначалі самім сабе і бескантрольна прымалі тыя, хто перахварэў на ковід-інфекцыю.

Спецыяліст адзначае, што людзі, якія паўнавартасна харчуюцца і з'ядаюць як мінімум 400 грамаў свежай гародніны і садавіны ў дзень, не маюць патрэбы ў дадатковым таблецыраваным прыёме полівітамінаў і мінералаў. Іх трэба прымаць, калі людзі перахварэлі, аслабленыя або маюць расстройствы стрававання, з-за чаго натуральныя вітаміны і мінералы ў іх дрэнна засвойваюцца. Таксама вітамінна-мінеральныя комплексы рэкамендуюць людзям, калі яны не харчуюцца паўнавартасна. Усім згаданым катэгорыям, каб падагнаць імунітэт, нейкі час можна прымаць прафілактычныя дозы полівітамінаў і мінералаў.

Вітаміны для прафілактыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў шырока прадстаўлены ў аптэках. Аднак у гэтым сэнсе яны бескарысныя. Апошнія 20 гадоў навукоўцы з розных краін вывучалі, як уплываюць на прафілактыку кардыяхвароб прыём вітаміну C, комплексаў A, E, C і іншых. Аднак, на жаль, усе спробы займацца прафілактыкай сардэчна-сасудзістых захворванняў з дапамогай «аптэчных» вітамінаў, мінералаў пацярпелі няўдачу.

— Значна больш эфектыўна для прафілактыкі хвароб сэрца і сасудаў весці здаровы спосаб жыцця. Калі больш канкрэтна, прытрымлівацца прынцыпаў правільнага харчавання, не пераядаць, больш рухацца, высыпацца і не перанапружвацца. Тым, хто курыць, — «завязаць», тым, хто злоўжывае спіртным, — кінуць піць. Сэрца любіць прагулкі на свежым паветры і пазітыўны настрой. А вось стрэсы яго губяць, — кажа Вольга Суджаева.

### ФІТАЗБОРЫ І ТРАВЯНЫЯ ЧАІ МОЖНА ПІЦЬ НЕ ЎСІМ

Памятайце, што любая фітатэрапія мусіць быць падабрана спецыялістам. Для ўжывання фітазбораў ёсць выразныя паказанні і супрацьпаказанні. Перш чым піць травяныя чаі, пажадана пракансультавацца з урачом.

— Ужыванне некаторых травяных збораў можа справакаваць халецыстыты і пячоначныя праблемы. Акрамя таго, любыя травяныя зборы ўтрымліваюць вітамін D, які можа прывесці да змены метабалізму ў людзей з мігальнай арытміяй або з механічнымі клапанамі сэрца. Такія людзі пастаянна прымаюць антыкаагулянты. І калі яны будуць піць фітачаі, папярэдне не параіўшыся са сваім урачом, то лекі, якія разрэджваюць кроў, перастануць працаваць, як трэба, — папярэджвае ўрач.

У спякоту чалавек шмат пацее, з-за чаго ў яго павышаецца рызыка тромбаўтварэння. Таму трэба наталяць смагу натуральнымі напоямі, якія валодаюць лёгкім дзеяннем і разрэджваюць кроў. У спякоту вельмі карысныя хатнія ліманады з лёдам, калі цытрусавыя заліваюцца кіпячонай вадой. Таксама падыдуць журавінавыя морсы і адвары з сухафруктаў без цукру. А вось ў гарачыню варта адмовіцца ад падфарбаваных падсаложаных напояў, салодкіх адвараў і газіроўкі, квасу.

У зялёным чаі змяшчаецца вялікая колькасць вітаміну D, таму адным людзям ён карысны, а іншым — шкодны. Калі чалавек прымае прэпараты, якія разрэджваюць кроў (варфарын, фенілін), то яму піць зялёны чай катэгарычна нельга. Рэч у тым, што на фоне ўжывання зялёнага чаю канцэнтрацыя гэтых лекаў у крыві можа катастрафічна змяніцца і прывесці да драматычных наступстваў. Іншымі словамі, зялёны чай і згаданыя антыкаагулянты несумяшчальныя. На жаль, далёка не ўсе людзі дачытваюць памяткі да канца.

Шматлікая інфармацыя ў розных крыніцах аб карысці кавы ці чаю, як правіла, ініцыяваная кававымі і чайнымі кампаніямі. Даказаная карысць чорнай кавы пры яе разумным ужыванні — 1-2 кубкі ў дзень. Таму што кафеін — усё-ткі лекавы сродак. Тым, у каго ёсць праблемы з артэрыяльным ціскам ці парушэнні сардэчнага рытму, кардыёлаг раіць не захапляцца чорнай кавай, асабліва моцнай.

# АМАЛЬ 70 % БЕЛАРУСАЎ ПРЫШЧАПІЛАСЯ АД COVID-19



**У Беларусі больш за 6 мільёнаў 466 тысяч чалавек атрымала адну дозу вакцыны супраць COVID-19, з іх больш як 6 мільёнаў 376 тысяч чалавек прайшло поўны курс вакцынацыі, паведамляе Міністэрства аховы здароўя.**

У Брэсцкай вобласці поўны курс вакцынацыі прайшло больш за 892,1 тысячы чалавек, у Віцебскай — больш за 789 тысяч, у Гомельскай — больш за 972,8 тысячы, у Гродзенскай — больш за 693,1 тысячы, у Мінску — больш за 1 мільён 249 тысяч, у Мінскай вобласці — больш за 979,1 тысячы, у Магілёўскай — больш за 689,6 тысячы.

Адну дозу вакцыны атрымала больш за 147,8 тысячы падлеткаў 12-17 гадоў, з іх больш за 142 тысячы прайшло поўны курс вакцынацыі.

Такім чынам, ахоп адной дозай вакцыны складае 69,2 % ад агульнай колькасці насельніцтва краіны, поўным курсам вакцынацыі ахоплена 68,2 % беларусаў. Таксама праводзіцца бустарная вакцынацыя, ахоп складае 14,5 %.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

13 ліпеня 2022 г. № 26 (662)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


САЦЫЯЛЬНЫ ВЕКТАР

# НЯЗМЕННЫ ПРЫЯРЫТЭТ







**На мінулым тыдні ў сталіцы адчыніў свае дзверы значны сацыяльны аб'ект — гарадскі дзіцячы клінічны цэнтр па стаматалогіі. Будынак адкрыўся пасля капітальнага рамонту з мадэрнізацыяй, які пачаўся ў маі 2021 года і завяршыўся 28 чэрвеня 2022 года. Цэнтр будзе аказваць медыцынскую дапамогу па тэрапеўтычнай, хірургічнай, артадантычнай стаматалогіі маленькім пацыентам. Таксама тут будуць праводзіцца дыягнастычныя мерапрыемствы. Прыцягваць да лячэння дзяцей стануць супрацоўнікаў профільных кафедраў. Тут будуць весці прыём па шэрагу назалогій, у тым ліку пацыентаў, якія маюць у анамнезе анкалагічныя захворванні, прыроджаную паталогію сківічна-тварнай зоны, дзяцей з высокай актыўнасцю карыёзнага працэсу, цяжкімі саматычнымі захворваннямі з праявамі ў поласці рота, з абмежаванай здольнасцю да перамяшчэння.**

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны Прэзідэнта па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА**, якая прысутнічала на ўрачыстым адкрыцці цэнтра, адзначыла, што работы на аб'екце былі выкананы ў кароткі тэрмін, і выказала ўпэўненасць, што тут створаны камфортныя ўмовы для работы спецыялістаў і прыёму маленькіх пацыентаў.

Сапраўды, рэканструкцыю і мадэрнізацыю правялі ўсяго за год, прычым ва ўмовах моцнага эканамічнага ціску і санкцый. Гэта сведчанне таго, што, нягледзячы на санкцыі, краіна развіваецца, дзяржава выконвае ўсе існуючыя задачы. «Няма ніякага сумнення, што мы будзем развіваць гэтак жа ў далейшым і ўсе запланаваныя мерапрыемствы, усе праграмы па сацыяльнай падтрымцы нашых грамадзян будуць выконваца аднязначна», — сказала Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што нядаўна на нарадзе ў Прэзідэнта разглядаліся ў тым ліку пытанні, якія датычацца функцыянавання сацыяльнай сферы. «Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз аднязначна нацэліў урад на тое, каб тыя людзі, якія маюць патрэбу ў падтрымцы, яе безумоўна атрымалі. Хачу вас запэўніць, што ў нашай дзяржаве так будзе і ў далейшым», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Спікер заўважыла, што Прэзідэнт вельмі ўважліва ставіцца да сістэмы аховы здароўя. У прыватнасці, работнікам галіны з 1 ліпеня прадугледжваецца павышэнне заработнай платы, разглядаецца жыллёвае пытанне адносна медработнікаў.

Наталля Качанава таксама адзначыла, што ў Беларусі часта адкрываюцца медыцынскія ўстановы, таму што клопат аб здароўі грамадзян — адзін з напрамкаў сацыяльнай палітыкі. «А клопат аб дзецях, іх здароўі — гэта прыярытэт, таму важна, што ў Мінску адкрываецца сёння такая ўстанова», — дадала Старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер адзначыла, што згаданы цэнтр аснашчаны найноўшым абсталяваннем, тут укаранёны сучасныя тэхналогіі. «Гэта пацвярджаюць нашы спецыялісты, і я ўпэўненая, што тут будзе аказваца кваліфікаваная прафесійная дапамога — не толькі лячэнне, але і кансультацыі, дыягностыка», — сказала Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала кіраўніцтву сталіцы за намаганні па развіцці сістэмы аховы здароўя горада. Установы набываюць сучасны выгляд, закупляюцца сучаснае абсталяванне, медыцынскія прэпараты. Разам з тым, перад сістэмай аховы здароўя на перспектыву стаяць важныя задачы, у тым ліку па будаўніцтве інфекцыйнай бальніцы, завяршэнні рэканструкцыі дзіцячай інфекцыйнай бальніцы. «Планаў шмат, я ўпэўненая, што яны будуць рэалізаваны, у гэтым няма ніякага сумнення», — падкрэсліла Наталля Качанава.

**Паводле БелТА.**

**Фота Віктара ДРАЧОВА і БелТА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Новы законапраект, развіццё сталіцы, энергетыка

### Расказваем галоўныя навіны мінулага тыдня

● Пад кіраўніцтвам **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ** адбылося пасяджэнне экспертнага савета. Спецыялісты разгледзелі шэраг пытанняў, сярод якіх праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь». Законапраект накіраваны на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, стабільнасці грамадска-палітычнай сістэмы і канстытуцыйных асноў дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь. Адной з прапанаваных экспертамі навацый з'яўляецца ўвядзенне нормы аб страце грамадзянства ў сувязі з наяўнасцю прыгавору суда Рэспублікі Беларусь, які ўступіў у законную сілу, пацвярджае ўдзел асобы ў экстрэмісцкай дзейнасці або прычыненне ім цяжкай шкоды інтарэсам дзяржавы, калі такая асоба знаходзіцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

● **Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная па г. Мінску Наталля КАЧАНАВА** правяла нараду з кіраўніцтвам сталіцы. На парадак дня вынесены актуальныя пытанні жыццядзейнасці горада. У нарадзе ўзялі ўдзел памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Мінску Аляксандр Барсукоў, міністр унутраных спраў, упаўнаважаны па Мінску Іван Кубракоў, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір Кухараў, намеснікі старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўнікі адміністрацый раёнаў сталіцы.

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар ДВА «Белпалівагаз» Аляксей КУШНАРЭНКА** ўзяў удзел у рабочай сустрэчы з дэлегацыяй Выканаўчага камітэта Электраэнергетычнага савета СНД, якая прайшла на базе Міністэрства энергетыкі. Былі абмеркаваны перспектывы і магчымы фармат супрацоўніцтва ў галіне падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў для энергетычнай галіны, методыкі і спосаб атэстацыі сумесных адукацыйных праграм, актуальныя інструменты лічбавай адукацыі. Сенатар расказаў аб сістэме падбору і падрыхтоўкі кадраў у аб'яднанні «Белпалівагаз», а таксама аб лічбавай трансфармацыі адукацыйнага працэсу ў галіне.

● **Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** правёў сустрэчу з працоўным калектывам ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі». Абмяркоўваўся шэраг важных тэм — роля і месца моладзі ў сучаснасці і будучыні краіны, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне моладзі, захаванне гістарычнай памяці, работа Маладзёжнага парламента і іншае. Сенатар азнаёміўся з работай навукова-практычнага цэнтра, яго матэрыяльна-тэхнічнай базай — высокатэхналагічным лячэбным і дыягнастычным абсталяваннем, з умовамі для пацыентаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# БЫЛО ЧАМУ ЗДЗІВІЦЦА І ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА

## Як магілёўскія дэпутаты ездзілі па вопыт да брэсцкіх




**У Магілёўскім райсавеце не прывыклі варыцца ў сваім саку — дэпутатам цікавы вопыт калег з іншых раёнаў. Вырашылі накіравацца з усходу на захад — на Брэстчыну, бо чулі шмат карыснага ад калег. Дык чаму б на месцы не пацікавіцца, як арганізавана работа? Сазваніліся, сабраліся... Паездка, кажуць, атрымалася змястоўнай.**

У дэлегацыю пад кіраўніцтвам старшыні Магілёўскага райсавета Сяргея Ярошчанкі ўвайшлі прадстаўнікі як прадстаўнічай, так і выканаўчай улады раёна. Цікавасць складаў вопыт узаемадзеяння органаў мясцовага кіравання і самакіравання з выканаўчай уладай і прадпрыемствамі, а таксама дзейнасць па развіцці асабістых падсобных гаспадарак і арганізацыі самазанятасці насельніцтва. Дэлегацыя наведала шэраг прадпрыемстваў і прыватных гаспадарак у Брэсцкім, Столінскім і Лунінецкім раёнах.

— Мяркуючы па тым, што мы бачылі, звычкі працаваць і быць адказнымі закладваюцца там яшчэ ў дзяцінстве, — адзначыла **старшыня Сідаравіцкага сельвыканкама Алена ПШАНІЧНАЯ**. — Шматдзетныя сем'і, якіх тут нямала, жывуць у дастатку. І гэта вынік менавіта іх працы. Звярнула ўвагу і на тое, што дамы ўздоўж дарог, па якіх мы ехалі, дагледжаныя, участкі засеяныя, ніводны кавалачак зямлі не пустуе. Парадавала вялікая арганізаванасць мясцовых жыхароў. Яны не толькі праяўляюць ініцыятыву па добраўпарадкаванні, але і самі бяруцца за рэалізацыю сваіх ідэй. Ім дапамагаюць прадстаўнікі мясцовага самакіравання і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на агульнай тэрыторыі. Адчуваецца, што яны — адна каманда.

Уразілі дэлегацыю з Магілёўскага раёна і дэмаграфічныя поспехі заходніх суседзяў. У адным з сельсаветаў ім паведамілі, што на яго тэрыторыі пражывае 225 шматдзетных сем'яў. І дзяцей у тых сем'ях — не тры, як гэта бывае часцей, а восем і нават 14.

— Пакарылі душэўнасць і шчырасць гэтых людзей, — кажа Алена Пшанічная. — Яны аж свецяцца ад дабрыні. Магчыма, яшчэ і таму, што насельніцтва ў асноўным веруючае. Там ёсць і праваслаўныя, і каталікі, і баптысты. Але яны вельмі паважліва ставяцца адно да аднаго, ніхто нікому не навязвае свае інтарэсы.

Для сябе прадстаўнікі Магілёўшчыны адзначылі яшчэ і такую акалічнасць: на Брэстчыне не існуе праблем з кіруючымі кадрамі. Кіраўнікі гаспадарак і структурных падраздзяленняў амаль не мяняюцца, працяглы час працуюць на адным месцы. Як вынік, яны паспяваюць цалкам рэалізавацца, што вельмі добра ўплывае на агульны стан спраў.

У Лунінецкім раёне, які лічыцца ў Беларусі лідарам па пастаўцы клубніц на беларускі рынак, госці паназіралі за работай аптовага рынку па рэалізацыі ягад. Кіраўніцтва Дварэцкага сельсавета падзялілася падрабязнасцямі стварэння гандлёвай пляцоўкі і барацьбы з несанкцыянаваным продажам. Гэта таксама ўзята на заметку.

Была магчымасць у згаданым раёне абмеркаваць праблему самазанятасці на прыкладзе аграгарадка Вулька-2. Там расказалі, як вырашаюцца пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва, якое аказваецца садзейнічанне ў стварэнні і развіцці асабістых падсобных гаспадарак.

У Мікашэвічах прадстаўнікі Магілёўскага раёна даведаліся, як арганізавана супрацоўніцтва гарсавета з мясцовым прадпрыемствам «Граніт». Разам яны вырашаюць пытанні стварэння ў горадзе спрыяльнага асяроддзя для пражывання.

Было чаму павучыцца і на Століншчыне, дзе існуе знакамітая на ўсю краіну фермерская гаспадарка братоў па прозвішчы Грыб. Ім яна дасталася ў спадчыну ад бацькі, які заснаваў сваю фірму ў пачатку 1990-х. Сёння яго сыны — самастойныя паспяховыя фермеры. Вырошчваюць гуркі, капусту, памідоры, іншую гародніну. Прычым актыўна выкарыстоўваюць у гаспадарцы разумныя тэхналогіі. Механізацыя і аўтаматыка дапамагае быць мабільнымі і пастаўляць прадукцыю не толькі на сталы землякоў, а нават за мяжу.

— Такія паездкі вельмі каштоўныя, — адзначае выконваючы абавязкі **старшыні Дашкаўскага сельвыканкама Сяргей ГАЛЯНТАЎ**. — Уразілі самі людзі, вельмі працалюбівыя. Ды і ў арганізацыі работы ёсць чаму павучыцца. Напрыклад, дарогі абслугоўваюць не камунальнікі, як у нас, а спецыялізаваныя дарожна-рамонтныя будаўнічыя арганізацыі. А могілкамі займаюцца не сельсаветы, а ЖКГ. Мы ж павінны тое рабіць самі, хоць і не спецыялізаваная арганізацыя. Цікавіліся таксама, як адбываецца пакос травы ў населеных пунктах. Для іх такога пытання наогул не існуе. Людзі косяць усё самастойна, у іх няма ні кавалачка недагледжанай зямлі.

Што датычыцца вялікіх тэрыторый або паркаў, то на Брэстчыне гэтай справай часцей за ўсё займаюцца прыватныя арганізацыі або індывідуальныя прадпрымальнікі. Праўда, там на парадак менш пустых тэрыторый. Людзі зацікаўленыя апрацоўваць зямлю і мець з яе даход.

— Усё ўбачанае — гэта вельмі карысны і неабходны для нас досвед, — кажа **старшыня Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ЯРОШЧАНКА**. — Асабістыя падсобныя гаспадаркі — гэта наогул прыклад для пераймання. У нас у раёне таксама распрацавана праграма па развіцці такіх гаспадарак. І, вывучыўшы вопыт калег, мы ўжо ведаем, што трэба дадаць у праграму, каб аддача была вышэйшая. Перш за ўсё гэта датычыцца падтрымкі сялян у рэалізацыі вырашчанай прадукцыі.

Дэпутаты таксама дамовіліся наконт візіту брэсцкай дэлегацыі ў Магілёўскі раён.

— Нягледзячы на тое, што ў нас свая спецыфіка, шмат ёсць і агульнага, — падкрэсліў старшыня Магілёўскага райсавета. — Мы падзяліліся інфармацыяй наконт інвестыцыйнага форуму «Магілёўскі рэгіён — тэрыторыя магчымасцяў», які праводзіцца 12 жніўня. Нашы брэсцкія калегі зацікавіліся і паабяцалі прыехаць.

Што датычыцца атрыманага на Брэстчыне вопыту, то яго плануецца абмеркаваць з мясцовым насельніцтвам і найлепшае па магчымасці ўкараніць.

— Мы штомесячна праводзім выязныя дні Саветаў і разглядаем на іх тыя ці іншыя важныя моманты, — удакладняе Сяргей Ярошчанка. — Чарговы Дзень пройдзе на базе Сідаравіцкага сельсавета. Там мы збяром прадстаўнікоў мясцовай улады, ініцыятыўных грамадзян, дэпутатаў, прадпрымальнікаў. Мы зрабілі відэа таго, што ўбачылі ў Брэсцкім раёне. Пакажам гэты відэаролік. Магчыма, нехта зацікавіцца і нешта возьме для сябе на ўзбраенне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ФОРУМ РЭГІЁНАЎ: ВЫНІКІ

# «Дарожныя карты» прававога поля

## Беларусь і Расія плануюць прыняць 420 інтэграваных законаў, у тым ліку Закон «Аб Парламенцкім сходзе Саюзнай дзяржавы»

**Прававыя аспекты далейшага збліжэння заканадаўства Саюзнай дзяржавы былі разгледжаны на адной з секцый Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Лейтматыў выступленняў удзельнікаў пасяджэння можна вызначыць так — саюзнае заканадаўства павінна быць скіравана на тое, каб стварыць роўныя правы і магчымасці для работы ўсіх сфер гаспадаркі дзвюх краін, а таксама для іх грамадзян. Форум рэгіёнаў павінен быў выявіць вузкія месцы, каб звярнуць на іх увагу ў далейшай сумеснай рабоце над нарматыўнымі актамі.**

Было адзначана, што інтэграцыя найбольш бачная менавіта на рэгіянальным узроўні. Але інтэграцыйныя працэсы стрымліваюць розныя прававыя базы. Такія бар'еры варта як мага хутчэй здымаць. Аб гэтым заявіў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі Вадзім ІПАТАЎ**. Ён адзначыў, што зняцце бар'ераў павінна адбывацца ва ўсіх сферах, у тым ліку ва ўзаемадзеянні паміж органамі ўлады і грамадзянамі. Гэта датычыцца міграцыйнай і візавай прастор, працоўнага заканадаўства, турызму, аказання медыцынскай і сацыяльнай дапамогі, парадку паступлення ў ВНУ і іншых аспектаў. Тыя крокі, якія далі эфект, трэба працягваць рабіць.

— Важнае месца на шляху да збліжэння заканадаўства Беларусі і Расіі займае распрацоўка перспектыўных кірункаў, або Канцэпцыі гарманізацыі і ўніфікацыі заканадаўства Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы, якія будуць своеасаблівай дарожнай картай. Распрацоўку такіх праграмных дакументаў трэба ажыццяўляць з прыцягненнем экспертаў дзвюх дзяржаў, — лічыць Вадзім Іпатаў. — Цяпер на розных пляцоўках абмяркоўваецца магчымасць прыняцця Закона Саюзнай дзяржавы «Аб Парламенцкім сходзе Саюзнай дзяржавы».

Па словах **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ігара СТАРАВОЙТАВА**, сярод 28 саюзных праграм ёсць і праграма па сацыяльнай сферы, якая ўключае працоўныя адносіны, занятасць, сацыяльнае страхаванне і пенсіённае забеспячэнне, падтрымку дзяцей з дзецьмі і іншае. Усе гэтыя раздзелы разглядаюцца з пазіцый абедзвюх краін для далейшай гарманізацыі заканадаўства. Некаторыя пункты павінны быць вырашаны ўжо сёлета.

Патрэбная ўзгодненая пазіцыя ў адукацыі і навуковай дзейнасці. Неабходна перагледзець прынятыя раней дамоўленасці, бо некаторыя падпісаны яшчэ ў 1990-я гады, лічыць **дацэнт кафедры грамадзянскага права Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў Марыя МЯШЧАНАВА**. Між тым, механізм сучасных дагавораў можна назваць даволі эфектыўным. У якасці прыкладу можна прывесці агульную адукацыйную праграму, якая ажыццяўляецца БДУ сумесна з Універсітэтам дружбы народаў па магістарскай падрыхтоўцы ў сферы права з выдачай дыпломаў адразу дзвюх ВНУ. Двайны дыплом дае права працаваць у абедзвюх краінах.

У рамках Саюзнай дзяржавы прыняты закон аб турызме, які ўступае ў дзеянне з 1 студзеня 2023 года і прадугледжвае ўніфікацыю дадзенай сферы для абедзвюх краін. Будуць уносіцца адпаведныя змяненні і ў пастанаўленні спартыўнай сферы. Як вядома, спорт сёння асабліва адчувае ціск санкцый. Таму важна стварыць умовы для яго развіцця праз інтэграцыю Беларусі і Расіі.

Як расказаў **першы намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Уладзімір ПАЛЯТАЕЎ**, на Форуме былі разгледжаны прававыя пытанні па многіх аспектах — эканамічным, энергетычным, мытным, спартыўным, навуковым.

— Можна сказаць, што інтэграцыя нашых дзяржаў ідзе хуткімі тэмпамі, — падкрэсліў Уладзімір Палятаеў. — Гэтаму спрыяе пазіцыя нашых прэзідэнтаў, якія далі канкрэтныя пасылы нашым урадам. Цяпер мы сінхранізуем гарманізацыю заканадаўства, каб забяспечыць усе неабходныя перадумовы для нашай работы. Мы павінны прыняць такое заканадаўства, якое будзе спрыяць грамадзянам і Беларусі, і Расіі. Дамоўленасць у асноўных кірунках дасягнута. Вядома, жыццё ўносіць свае карэкціроўкі, таму і змяненне заканадаўства — працэс працяглы. Магчыма, мы ў нечым адстаём, але ёсць графік заканадаўчай ініцыятывы, мы павінны прыняць 420 законаў. Думаю, трэба скарыстацца міжнароднай практыкай, узяць усё найлепшае і прымяніць у сябе.

Беларускі бок гатовы падключыцца да тых інтэграцыйных праектаў, якія цяпер распрацоўваюцца, заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**. Ён заўважыў, што для далейшай работы патрэбная «фактура» — гэта дэкрэт Вышэйшага дзяржаўнага савета, пастанова Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі альбо іншыя прававыя акты.

— Мы пачынаем абмяркоўваць найбольш шырокія пытанні, звязаныя з грамадска-палітычным станам Саюзнай дзяржавы, з магчымасцю прыняць акт Саюзнай дзяржавы, які дазваляе развівацца ёй як суб'екту, — расказаў Сяргей Сівец. — Усе прапановы скіраваны на тое, каб нашы дагаворы працавалі. І гэта нам пацвердзілі прадстаўнікі дзяржаўных органаў улады, якія з'яўляюцца выканаўцамі нашых саюзных праграм па інтэграцыі. Мы гатовыя падключыцца да ўсіх інтэграцыйных праектаў.

Па словах парламентарыя, колькасць заканадаўчых камісій павялічваецца. Гэта дае магчымасць больш аператыўна рэагаваць на выклікі часу і ствараць неабходную прававую базу. Пакуль усе праблемныя моманты і недапрацоўкі вырашаюцца без фарміравання наднацыянальных органаў. Між тым, такія структуры рана ці позна будуць створаны, заявіў Сяргей Сівец.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# АРХІТЭКТУРНЫЯ БАТАЛІІ ПА-ВЯСКОВАМУ

## Як з закінутай будыніны зрабіць зону адпачынку



Фотазона, зробленая рукамі цераxоўскіх актывістаў — Аляксандрам КУЗНЯЦОВЫМ, Юрыем АСАДЧЫМ і Яўгенам МАЛАЕВЫМ.

**На Добрушчыне раённы выканкам і Савет дэпутатаў незвычайным чынам заматывавалі добраўпарадкаваць свае населеныя пункты вясковых «архітэктараў». Для жыхароў 12 сельсаветаў абвясцілі спаборніцтвы на найлепшы комплекс малых архітэктурных кампазіцый. Вопыт атрымаў столькі станоўчых рэакцый ад вяскоўцаў, што пазайздросцілі нават жыхары райцэнтра.**



Выконваючы абавязкі старшыні Усохабудскага сельвыканкама Ала ХУЗЕЕВА сустракае ў новым міні-скверы старшыню і галоўнага спецыяліста Добрушскага райсавета дэпутатаў Уладзіміра МАЛІНОЎСКАГА і Марыну ШУМІЛАВУ.

— Рэйсаў дзесяць на матаблоку прыйшлося зрабіць, каб толькі цэглу прывезці, — аб тым, як чысцілі-аднаўлялі будматэрыял ад рэштак старога раствору, вазілі зямлю, пясок з вадой, рабілі кладку, выкошвалі і прыбіралі тэрыторыю будучай зоны адпачынку, расказваюць жыхары вёскі Усохская Буда — Аляксандр Нічыпаркоў і Аляксандр Падсасонны, Сяргей Шэрсцень і Сяргей Пархоменка, Міхаіл Кажамяка.

Гэта толькі тыя з вяскоўцаў, хто ўзяў на сябе асноўныя будаўнічыя работы падчас уладкавання новай «зоны спакою». Так цяпер месцічы называюць свой міні-сквер, што атрымаўся вакол малых архітэктурных кампазіцый. Многія з іх за свае сродкі вырабілі драўляных і жалезных спраў майстры — цёзкі Сяргей Мінкоў і Сяргей Кулібаў. Жанчыны Усохскай Буды пад кіраўніцтвам старэйшыны Святланы Гоганавай узялі на сябе азеляненне і дэкор. Вынікі сваёй работы прадставілі на конкурс.

— Усяго звыш паўсотні чалавек — гэта толькі самыя-самыя актыўныя, хто дапамог стварыць наш міні-сквер, — тлумачыць галоўны ідэйны натхняльнік вяскоўцаў, выконваючая абавязкі **старшыні Усохабудскага сельвыканкама Ала ХУЗЕЕВА**.

Дзякуючы яе падтрымцы, менавіта ўсохабудскія «архітэктары» сталі пераможцамі раённага агляду-конкурсу на найлепшую комплексную малую архітэктурную форму. Яны не толькі зрабілі праект «ад А да Я» сваімі рукамі, але вырашылі і актуальныя пытанні.

— Узялі пакінуты дом, які па рашэнні суда перададзены ва ўласнасць сельвыканкама і па якім прынята рашэнне аб зносе. Самі разабралі старую цагляную пабудову і з гэтага матэрыялу стварылі свае малыя архітэктурныя формы, — падзялілася Ала Хузеева. — Вакол іх увосень будзем закладваць вішнёвы сад. Дзеці вельмі чакаюць. Хочуць самастойна даглядаць-паліваць дрэўцы.

Для іх жа — тут больш за паўсотню дзяцей — адразу пасля стварэння архітэктурных кампазіцый усохабудскія актывісты ўзяліся за новы праект. Рыхтуюцца сваімі сіламі пабудаваць дзіцячы спартыўны гарадок.

— Школы няма, але ёсць свой дзіцячы садок, дашкалятак у нас — больш за дзесяць, а спартыўнай гульнявой зоны на тэрыторыі вёскі няма, — расказвае **жыхарка Усохскай Буды, мама пяцярых дзяцей Наталля УДОДАВА**.

Шматдзетная маці самастойна намалявала эскіз-праект будучага дзіцячага гарадка. Заручыўшыся падтрымкай і райсавета, і сельвыканкама, вяскоўцы цяпер рыхтуюць месца для будучага спартаб'екта.

— Нашы ўсе без пытанняў прапануюць сваю грашовую і фізічную дапамогу, але скідвацца будзем толькі на шрубы і фарбу. Нам пашанцавала: знайшлі спонсара, які бясплатна забяспечыў неабходнымі піламатэрыяламі, — выказвае ўдзячнасць шматдзетная маці. — Дзеці чакаюць не дачакаюцца, калі ўжо фарбаваць свой гарадок. Просяць чырвоную пясочніцу абавязкова.



Жалезных спраў майстар з Усохскай Буды Сяргей КУЛІБАЎ з жонкай Аленай.

Між тым, на ўвасабленне ідэй па ўзвядзенні малых архітэктурных кампазіцый у населеных пунктах удзельнікам агляду-конкурсу адвялі тры месяцы.

— Былі прад'яўлены і дакладныя патрабаванні. Кампазіцыі, напрыклад, павінны складаць асобны аб'ект, ствараць месца адпачынку і зносін. Вітаўся сістэмны падыход да дэкаратыўнага азелянення абранай тэрыторыі, — распавёў **старшыня Добрушскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір МАЛІНОЎСКІ**.

Архітэктурныя ж формы, скульптурныя кампазіцыі вяскоўцы павінны былі вырабіць з вызначаных матэрыялаў — каменю, цэглы, бетону, дрэва і металу. Прад'явілі да работ і дакладныя патрабаванні ў плане бяспекі і камфортнасці выкарыстання ў любую пару года. Адно з галоўных патрабаванняў, якія выставіў райсавет для стварэння кампазіцый, — забарона на выкарыстанне бюджэтных сродкаў для ўвасаблення праектаў. Ацэньвалася пры падвядзенні вынікаў і ступень актыўнага ўдзелу вяскоўцаў. Праект на найлепшую комплексную малую архітэктурную форму, які прапанавалі жыхары Усохскай Буды, здзівіў сваім прадуманым падыходам нават арганізатараў. Уладальнікам першага месца прысуджана грашовая ўзнагарода — 100 базавых велічынь. Сродкі можна будзе выкарыстаць толькі для далейшага добраўпарадкавання тэрыторый.



Самы адданы валанцёр на ўсіх вясковых праектах Леанід ГОЛУБЕЎ.

Другое месца і адпаведна 80 базавых велічынь прысуджана праекту гарадскога пасёлка Цераxоўка. Яго цяпер упрыгожвае малая архітэктурная кампазіцыя ў форме разгорнутай кнігі — камплімент да Дня беларускага пісьменства, свята, якое сёлета прымае Добруш. Месца для свайго праекта цераxоўцы абралі спецыяльна праблемнае, каб дасканала разабрацца з ім. Амаль у цэнтры, на перакрыжаванні дарог даўно разабралі старую будыніну, але ў зямлі заставаліся будматэрыялы, карані — нічога толкам не расло. Каб разраўнаваць тэрыторыю, цалкам ачысціць участак, заручыліся дапамогай камунальнікаў і сельгасарганізацыі. Увасобілі праект старшыня Цераxоўскага сельвыканкама Аляксандр Кузняцоў і вясковыя актывісты Юрый Асадчы і Яўген Малаеў. Ды так захапіліся, што зрабілі адразу тры комплексныя малыя архітэктурныя формы. Цяпер гэта самыя папулярныя ў Цераxоўцы фотазоны.

Між тым грашовыя ўзнагароды ў памеры 60 базавых велічынь за ўдзел у аглядзе-конкурсе атрымалі і ўладальнікі трэцяга, чацвёртага і пятага месцаў (падзялілі два населеныя пункты). Вызначыліся пасёлак Рассвет, аграгарадкі Івакі, Крупец і Баршчоўка.

— Жыхары Крупца і Івакаў на ўдзел у аглядзе-конкурсе прапанавалі дзіцячыя пляцоўкі. І калі ў Крупцы для ўладкавання зоны абралі месца як працяг існуючай дзіцячай зоны, то вяскоўцы Івакаў абралі для добраўпарадкавання вельмі складаную тэрыторыю, — распавяла **галоўны спецыяліст Добрушскага раённага Савета дэпутатаў Марына ШУМІЛАВА**, — вырашылі добраўпарадкаваць пустку, зарослую хмызняком, якая даўно псавала выгляд цэнтра аграгарадка. Колькі намаганняў людзі прыклалі, каб гэта ўсё раскарчаваць, цяжка нават уявіць. Цяпер плануюць за свае сродкі набыць і ўстанавіць там дзіцячы спартыўны комплекс.

Дарэчы, гісторыі, як вяскоўцы — удзельнікі агляду-конкурсу дабіваліся ўвасаблення сваіх ідэй, фотасправаздачы з усіх 12 сельсаветаў, імёны пераможцаў спаборніцтва былі апублікаваны ў афіцыйнай групе Добрушскага райвыканкама ў сацыяльных сетках — «Дыялог з уладай». Парадавала станоўчая рэакцыя жыхароў самога райцэнтра. Добрушцы так натхніліся прыкладам жыхароў сельскіх населеных пунктаў, што пачалі выступаць са сваімі ініцыятывамі для добраўпарадкавання месцаў агульнага карыстання ў горадзе. Райвыканкамам ужо прынята рашэнне аб правядзенні такога ж спаборніцтва для жыхароў Добруша.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара,**

*Добрушскі раён.*



Архітэктурны камплімент да Дня беларускага пісьменства ад жыхароў гарадскога пасёлка Цераxоўка Добрушскага раёна.

ПРЫЕМНА ПАЗНАЁМІЦЦА!

# З ХАТЫ ГЕРАІЧНАГА ПРАДЗЕДА

## «Паўдзельнічаць у конкурсе нас запрасіла старшыня сельсавета...»



Фота БелТА.

**Падчас купальскага фестывалю ў Александрыі па традыцыі былі падведзеныя вынікі любімага многімі конкурсу «Уладар вёскі». Пераможцамі рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта сталі Дзяніс і Юлія ВЯРАКСЫ, якія жывуць у вёсцы Барыскавічы Мазырскага раёна.**

Сужэнцы разам ужо дзесяць гадоў — чарговы юбілей сямейнага жыцця адсвяткуюць 28 ліпеня. Дзяніс — ваеннаслужачы пагранічных войскаў у аграгарадку Прудок, Юлія працуе ў Гомельскай мытні на пункце пропуску «Новая Рудня», цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску. Гаспадарка ў хаце невялікая, як і агарод — там усё выключна для сябе і дзяцей. Ёсць пчальнік на шэсць вулляў.

Сёння ў сям'і падрастаюць трое дзяцей: васьмігадовы Арсеній, шасцігадовы Усевалад і сямімесячная Аліса. Бацькі сцвярджаюць, што дачка падчас конкурсу было працай за ўсіх: яна амаль увесь час спала, ела і практычна не дадавала клопатаў. Сыны Арсеній і Усевалад актыўна ўключыліся ў творчую барацьбу. У выніку агульнымі намаганнямі не толькі ўзялі дыплом першай ступені, але і выйгралі ў намінацыі «Уладар вёскі ONLINE».

«Паўдзельнічаць у конкурсе нас запрасіла старшыня Прудкоўскага сельсавета, — успамінаюць сужэнцы. — Мы адразу пагадзіліся: заўсёды выступаем за любы пазітыўны рух. Аднак калі даведаліся, што трэба праходзіць не толькі творчыя выпрабаванні, крыху спалохаліся: ці справімся? Напрыклад, раней мы ніколі не пілавалі ручной пілой «Дружба», заўсёды карыстаемся бензапілой, то-бок нюансы былі. На шчасце, мы з усім справіліся».

У аснову канцэпцыі конкурснага выступлення пераможцаў лягла ідэя захавання гістарычнай памяці. «Гэтая тэма вельмі значная для нас, — кажа Юлія. — Мы жывём у сваім доме, які ў свой час пабудаваў прадзед мужа, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, гвардыі яфрэйтар Якаў Сцяпанавіч Капора».

У гады вайны прадзед Дзяніса дайшоў да Эльбы, меў баявыя ўзнагароды, у тым ліку тры ордэны Славы. Для сужэнцаў і іх дзяцей Якаў Сцяпанавіч — прыклад мужнасці і гераізму, на які хочацца раўняцца заўсёды і ва ўсім.




МЯСЦОВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# КВІТНЕЙ, «САД МАРЫ»!

**У гарпасёлку Янавічы Віцебскага раёна наведвальнікі дзённага аддзялення знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту будуць варыць варэнне і займацца фітатэрапіяй.**

Цікавы праект Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна «Сад мары» стаў пераможцам абласнога конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў. Рэалізацыю праекта, бюджэт якога складае больш за 40 тысяч рублёў, пачалі яшчэ ў красавіку. На тэрыторыі янавіцкага аддзялення разбіваюць дзівосны сад з пладова-ягаднымі раслінамі, цяпліцай і кветнікамі. Цеснае супрацоўніцтва ТЦСАН з кафедрай заалогіі і батанікі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава дазволіла высадзіць тут не толькі звыклыя для нашага клімату дрэвы, але і экзатычныя культуры: абрыкосы, чарэшні і садовыя буякі — выкладчыкі ўніверсітэта запэўнілі, што кліматычныя ўмовы паўночнага рэгіёна будуць спрыяць маладым саджанцам. Праект, разлічаны ў большасці на наведвальнікаў аддзялення, зробіць фітатэрапію даступнай і для мясцовых жыхароў — для ўсіх янавічан установяць незвычайныя лаўкі і альтанку.

— Добраўпарадкаванне тэрыторыі пад будучы сад мы пачалі яшчэ на рэспубліканскім суботніку 16 красавіка. Выкарчавалі хмызняк, разраўнавалі зямлю, прывезлі ўрадлівай глебы. Нядаўна ўстанавілі металічную агароджу і дэкаратыўную арку. Яшчэ ў планах зрабіць невялікую сажалку — месца рэлаксу і яднання з прыродай, разбіць аптэкарскі агарод з духмянай меліссай, мятай і лавандай, якія ў будучыні стануць асновай гарбаты для наведвальнікаў і гасцей, — адзначыла **дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна Кацярына ЛАЗОЎСКАЯ.**

У праекце «Саду мары» прадугледжана і перапрацоўка будучага ўраджаю: спецыяльна будуць закуплены электрасушылка, мультыварка, маразільная камера і халадзільнік. Дзіва, дый годзе: жанчыны на пенсіі змогуць варыць смачнае натуральнае варэнне ў кампаніі, дзяліцца кулінарнымі сакрэтамі і перадаваць вопыт маладому пакаленню, бо да праекта плануюць далучыць вучняў мясцовай школы з экалагічным ухілам. «Разыначкай» дзівоснага саду стане дрэва жаданняў, прычым незвычайнае: арт-аб'ект будзе ў выглядзе яблыні з малой архітэктурнай формай — драўляным вухам, памеры якога ўражваюць — метр на метр! Гэты метафарычны вобраз для таго, каб самыя запаветныя жаданні і мары старэйшага і маладога пакаленняў былі пачутыя і абавязкова споўніліся.

Такі вялікі праект немагчыма было б рэалізаваць без зацікаўленасці мясцовых органаў улады, грамадскіх аб'яднанняў і неабыякавых жыхароў. Ініцыятыўную групу будаўніцтва ўзначальвае загадчык Янавіцкага аддзялення ТЦСАН Людміла Кухарава. Шчыруюць дзеля агульнай справы спецыялісты на чале з дырэктарам раённага аддзялення, работнікі сельвыканкама, Суражскі лясгас, прадпрыемствы і арганізацыі, валанцёры БРСМ, мясцовыя жыхары.

— Кіраўніцтва Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна рэалізоўвае шмат карысных і важных праектаў дзеля падтрымкі і адаптацыі ў грамадстве людзей з абмежаванымі магчымасцямі, адзінокіх і пажылых грамадзян. Гэта — галоўная мэта іх работы, якую спецыялісты выконваюць бліскуча. Прыкладам служыць яшчэ адна ініцыятыва — інклюзіўны «Добры сад» у аграгарадку Кіраўская з пляцоўкай для гульні ў бочу, якая карыстаецца вялікім попытам у падапечных аддзялення, — адзначыў **старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар ДАРОЖКІН.**

Да раённага сельскагаспадарчага свята «Дажынкі-2022», месцам правядзення якога стане гарпасёлак Янавічы, «Сад мары» гасцінна расхіне свае абдымкі для наведвальнікаў і гасцей.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**



**На добраўпарадкаванні будучага «Саду мары».**

У праекце «Саду мары» прадугледжана і перапрацоўка будучага ўраджаю: спецыяльна будуць закуплены электрасушылка, мультыварка, маразільная камера і халадзільнік. Дзіва, дый годзе: жанчыны на пенсіі змогуць варыць смачнае натуральнае варэнне ў кампаніі, дзяліцца кулінарнымі сакрэтамі і перадаваць вопыт маладому пакаленню, бо да праекта плануюць далучыць вучняў мясцовай школы з экалагічным ухілам.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.**
**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2022 года.**

# «Мы навучыліся лётаць у небе, як птушкі...»,

## альбо Ёсць на зямлі мужчыны


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ветачка — Гаспадыня. Так-так — з вялікай літары, бо што прыгатаваць, што памыць-прыбраць, што пашыць-звязаць... Усё ўмее, усё робіць! Найлепшым чынам і дзень пры дні... Праўда — з перапынкамі: калі раз, а калі і два на год яна ўсё кідае і некуды едзе.**

**Вось і надоечы ўзяла білеты на цягнік — да сяброўкі махнула. Добра ім там — гэта без сумневу! А вось як яе «хлопцам»?.. «Ды гаруем», — праз тыдзень прызнаецца муж, і так жа цяжанька ўздыхнуўшы... Аж перапыніла, спытала: «Нешта зрабілася?» — «Дык Вета ж з'ехала»...**

**Як ні круці, а правільна зрабіла! Час ад часу трэба з'язджаць, каб хоць трохі адпачыць. І каб хоць так — адсутнасцю сваёй — «сказаць», як шмат ты робіш. І як шмат значыш.**

### Дрэнна? Добра!

Наша прымаўка: «З сынам сварыся ды на печ бярыся. З зяцем сварыся — за парог цягніся». Цётка Шура таму і не сварыцца. Шмат што, кажа, не бачу, шмат не чую... Гэта, між іншым, чыстая праўда: жанчына глухаватая — пасля даўняй хваробы.

...І з нядаўняй у бальніцы ляжала: у палаце пятай была.

Па начах, расказвала, дзве кабеты храплі, дзве з-за гэтага — амаль што не спалі... «А я (даслоўна) левае вуха ў падушку — і хоць са святымі вынось! Сплю — як пшаніцу прадаўшы!»

Адкуль мо і сапраўды — нічога няма ліхога, каб добрым не стала. Хоць калі-нікалі.

### Час лечыць

*...Не чакала, не гадала —*
*Гарадскою раптам стала:*
*Не жыццё пайшло, а рай —*
*Век жыві — не памірай!*
*Ні свіней тут, ні каровы*
*Ні турбот пра сена-дровы,*
*І ніякага мне гора,*
*Што жукі ды фітафтора...*
*Фікус раненька палью,*
*Кухню чыста прыбяру,*
*Кексаў напяку да кавы —*
*Вось і ўсе на сёння справы...*

Усе ды не ўсе, бо ў гараджанкі Міхайлаўны, аўтаркі гэтых радкоў, яшчэ ладная клумба з кветкамі, вязанне, кніжкі-газеты, хатнія камп'ютарныя курсы (дачка вядзе), да таго ж — штодня (пасля вельмі цяжкога ковіду) працяглая зарадка і — абавязкова — шпацыр.

На іх, ці не з першых дзён, Міхайлаўна «абрастае» кампаніяй. Бо не маўчыць: па добрай вясковай звычцы можа зачапіць хоць старога, хоць малога — разгаварыцца, пазнаёміцца, нумары мабільных запісаць. А там, глядзіш, ужо і дамовіцца, «тусоўку» стварыць — з пяці бабуль.

...Сёлетнім халодным маем яны яшчэ і дзеда прыкмецілі — сумнага-сумнага. Падумалі, мо таксама «ковіднік»? Мо нейкая іншая хвароба напала? Альбо ў сям'і што зрабілася?

«Паваражылі» так і — жанчыны ж! — міма не прайшлі: захацелі падбадзёрыць чалавека, нечым падтрымаць. Павіталіся, спыталі, чаму самотны такі? «Жонку пахаваў», — падзяліўся горам мужчына і з ахвотай расказаў, калі гэта здарылася, з якой прычыны, колькі ў шлюбе жылі...

Жанчыны паслухалі, паспачувалі — і ў той дзень, і потым віталіся з удаўцом, часам гаварылі: найбольш — пра надвор'е, бо яно (май ёсць май!) хоць памалу, але ж мянялася да лепшага і як ні круці — мяняла настрой. Нейкі панядзелак ну такі ўжо выдаўся — цёплы, сонечны... «Аж жаніцца хочацца!» — прызнаўся ўдавец.

...Пасля смерці жонкі (Міхайлаўна палічыла) прайшло сорак і яшчэ тры дні.

### Сіла слоў

На лецішчы пустазелле даймае: учора, здаецца, клумбу палолі, а сёння там зноў дзе-нідзе макрыца, хвошч, лебяда і раптам... званочкі — звычайныя, палявыя. Адкуль? Якім ветрам прынесла? Калі яны паспелі вырасці і, галоўнае, расцвісці?

...Рука не паднялася вырваць: можна сказаць, што Даль уратаваў, запісаўшы (і якое ж праўдзівае!): «Жыццё дае толькі бог, а забраць можа любая гадзіна».

### Язык у роце, як чорт у балоце

З майстрамі не шчасціць: адна цырульніца з'ехала за мяжу, другая — сышла ў дэкрэт...

На стрыжку хоць-нехаць ідзём да новай: настойліва раілі! Маўляў, і разумніца, і майстар, што трэба...

Не падманулі: дзяўчына і сапраўды ўсадзіла ў крэсла, ацаніла «фронт работ», спытала, як пастрыгчы? А ўжо далей...

Спрытнасць рук і ніякага махлярства! Хвілін мо з дзесяць прайшло, і ўсё: кліент, што называецца, гатовы. Можна дзякаваць, прывычна збіраць хвосцік... Але ж чаму самой?

— Калі ласка, — прашу майстрыху, працягваючы заколку. — У вас, напэўна, лепш атрымаецца?

— Не, — круціць галавой маладзіца. — У нас тут, між іншым, свая спецыфіка: я — майстар па стрыжках, мая калега — па ўкладках... Так што выбачайце.

Пара слоў, здавалася б, і...

Як кажа адна знаёмая: «Вы зрабілі ўсё, каб я ў ваш салон больш ніколі не прыйшла».

Што дзіўна — не рукамі.

### Што пасееш...

Надвячорак. Метро. Цягнік. Ён бадзёра падвозіць нас да чарговай станцыі — расчыняе дзверы.

Першым у вагон заходзіць падлетак гадоў 15, плюхаецца на апошняе вольнае месца, уключае смартфон і тут жа адключаецца ад рэальнасці. Пажылая дробненькая жанчына, што ішла ўслед, спыняецца побач, ставіць каля ног вялікую пузатую сумку. Мы едзем далей.

На наступнай станцыі народу заходзіць больш і непарадак (хлапчо сядзіць — жанчына побач стаіць) бачаць, напэўна многія, але маўчаць. Не маўчыць хіба адзін — падобна, былы вайсковец, бо голасам, які не цярпіць пярэчанняў, досыць гучна камандуе:

— Малады чалавек, саступіце месца бабулі!

Маладзён — нібы не чуе, бо вухам не вядзе: як сядзеў, так і сядзіць. А вось жанчына — крыўдзіцца:

— Я вам не бабуля! — заяўляе з форсам. — Я — калі хочаце ведаць — ягоная мама!

Вочы вайскоўца акругляюцца, бровы ў здзіўленні падымаюцца ўверх, вусны расплываюцца ў шырокай «паважлівай» усмешцы:

— О-о! Дык я вас віншую! — прамаўляе мужчына. — Вы думаеце, гэты ёлупень, калі вы станеце бабуляй, будзе клапаціцца пра вас таксама, як вы пра яго?

Жанчына ў адказ не сказала, здаецца, нічога.

Ці мы не пачулі?

### Цяжкая навука

Сваячка здзівіла: прыляцеўшы з Амерыкі і выпадкова трапіўшы на старыя вясковыя могілкі, раптам азірнулася і сказала: «А зараз я пакажу вам магілу прадзедаў... Мяне бабуля туды вадзіла — гадоў 50 таму».

Унучцы, значыць, не было пяці. Здавалася: што ў такім узросце запомніш?

Але ж госця ўжо кіравала ўглыб могілак і крочыла так упэўнена...

На пагорку спынілася, яшчэ раз азірнулася — нахілілася да помніка, і... Вось яны, родныя імёны-прозвішчы, даты жыцця, вось яны, бабуліны касачы ў кветніку!

Радасць, здаецца, не мела межаў!

А потым — і боль, бо нехта, наводзячы прыгажосць на суседняй магіле (ставячы помнік, агародку, укладваючы модную плітку), так па-свінску абышоўся з гэтай... Хай даўняй, але ж не закінутай, не забытай...

Крыўдна, калі жывыя крыўдзяць жывых, калі мёртвых — і слоў няма.

Класіка: мы навучыліся лётаць у небе, як птушкі, мы навучыліся плаваць пад вадой, як рыбы, і цяпер нам не хапае толькі аднаго: навучыцца жыць на зямлі, як людзі.

### Не пра Колю

Зноў жа вёска, як вёска, могілкі, як могілкі і помнікі, як помнікі... Хоць...

На адным — пасля прывычных прозвішча-імя, дат жыцця — «Памяць зяця (?) Колі і яго жонкі».

Пахаванне старое (цешчы не стала ў 1960-м), аднак магіла яе да сёння ў парадку — даглядаецца, ужо, напэўна ж, не зяцем...

Адкуль — бываюць родныя, як чужыя, і чужыя, як родныя.

...Сваё каханне Соня сустрэла ў краме: ёй росту не хапала, каб дастаць з паліцы пакет з аўсянкай, а хлопец праходзіў міма... Дапамог, усміхнуўся, пачакаў каля касы, пакуль разлічыцца, забраў у яе цяжкаватую сумку — сказаў, што можа данесці да кухні, а там і кашу зварыць.

Соня жыла адна. Хлопец ёй спадабаўся, але ж не настолькі, каб з'ехаць з глузду і з першых мінут знаёмства павесці яго дамоў...

Ён да яе прыйшоў праз месяц амаль штодзённых сустрэч, яна да яго — праз паўгода, каб пазнаёміцца з мамай і... застацца.

Косця правільна ўсё прыдумаў: пакуль сям'я ў іх малая, жыць можна разам, а яе, Сонiну, кватэрку здаваць. Усё ж капейка.

Усе ўтраіх яны працавалі, усе зараблялі (і не сказаць, каб мала зусім), але грошай усё адно не хапала. Косця хацеў памяняць машыну, зрабіць рамонт у кватэры, купіць новую мэблю...

Яго сябры ездзілі на заробкі. Ён таксама звольніўся з работы, падаўся следам. Спачатку досыць часта прыязджаў дадому — прывозіў падарункі, грошы, потым — нейк радзей і радзей. Можна сказаць, зусім без яго Соня адхадзіла ўсю цяжарнасць, нарадзіла дачку. Са свекрывёю ўдзвюх яны гадавалі. Косця дапамагаў на адлегласці — прысылаў грошы, гады ў рады прыязджаў, а потым прызнаўся, што ў яго ёсць іншая жанчына, іншая сям'я.

Соня тады збірала свае рэчы — думала вярнуцца дамоў. Свякроў не пусціла. Сказала, што ў яе сына можа быць іншая жонка, а вось ёй іншай нявесткі не трэба. Ды і з дзіцем удзвюх прасцей.

Так яны і жылі, пакуль свякроў не захварэла, не злягла. Тут ужо сын «знайшоўся» — прыехаў, згадзіўся забраць да сябе. «Ты ж не аддасі мяне?» — з надзеяй спытала свякроў у нявесткі. Хоць магла і не пытаць, бо Соня глядзела яе, як родную... Да апошняга. Сын хіба развітацца прыязджаў — адзін, на вялікай, новай машыне.

І потым «правы не качаў»: згадзіўся, што кватэра застаецца ўнучцы. Але ж рэчы...

Найдаражэйшыя з іх — матуліны іконы, альбомы з фотаздымкамі, даматканыя і вышываныя ёю навалкі-абрусы, зачытаныя кнігі... Усё гэта Соня складвала ў сумкі-пакеты: Косцю, яго новай сям'і — на памяць.

Той, убачыўшы «вандзэлкі», хіба ўхмыльнуўся! Сказаў, што ён не бедны, што яму нічога не трэба, што маці ёсць маці, што ён яе сын, будзе помніць і так.

Соня, як заўжды, не спрачалася: можа, і будзе. Нават больш, чым яна...

Хоць гэта — наўрад, бо яна не толькі помніць: яна штодня ўспамінае — мыючы маміны талерачкі, прасуючы ручнікі, паліваючы фіялкі...

Бываюць родныя, як чужыя, і чужыя, як родныя.

### Ёсць на зямлі мужчыны...

Гэта ўжо за правіла: спытай у Ніны, як справы, і яна абавязкова раскажа, якія сёлета агуркі-памідоры, якія клубніцы-чарэшні-часнок і віды на яблыкі, бульбу, мёд, буякі... Пасля чаго абавязкова дадасць: «Дзякуй богу! Будзе што і людзям даць, і сабе пакінуць».

Зрэшты, пра сябе Ніна можа забыцца. З ёй часта гэта бывае, што вельмі раздражняе старэйшых «гарадскіх» сясцёр.

І каб толькі іх!

Некалі даўно ў Ніны яшчэ і кавалеры былі. Два з іх (у розныя часы) — ногі пазбівалі: заляцаліся, замуж клікалі. І абодва пры гэтым жыцця вучылі. Ты ж, казалі, не маці Тэрэза, каб усё раздаваць? Пра сябе трэба думаць. Альбо грошы браць. «Во, — уздыхала Ніна, — яшчэ не жаніліся, яшчэ палец на палец не паклалі, а ўжо камандуюць, гаспадараць... Дык жа не: мая праца — маё права: як захачу, так і зраблю...

Вось і робіць — адна, ад цямна да цямна, бо, казала, мужчын пад яе характар проста не існуе. Аж тут...

Яна ў Мінск прыязджала: добрым людзям «гуманітарку» прывозіла. І ў добры ж як быццам дзень: сіноптыкі цяпло абяцалі. Яна лёгка адзелася... А сабралася ехаць назад — нейкі вецер узняўся... Проста ў твар. І такі ледзяны!

Ніна каўнер у пінжаку наставіла, адной рукой штрыфлі на грудзях трымала, другой — полы спадніцы. Так, напэўна, шмат хто ішоў — і поруч, і насустрач, але ж адзін...

Ніна згледзела, што ён прыгожы, не гадоў, што таксама лёгка апрануты, хіба шалік на шыі — чорны, шырокі, відаць, жаночы?.. Нехта наматаў, каб яму цяплей было. А ён, згледзеўшы Ніну, стаў «размотваць»: вазьміце, маўляў, калі ласка... «Што вы, што вы? Не трэба! — стала бараніцца Ніна. — Я на электрычку. Мне блізка ўжо!»

Пару імгненняў побач і...

Ён — у адзін бок, яна — у другі.

Дамоў прыехала. Жыве, працуе: днямі, вечарамі і часам начамі (калі не дужа стоміцца) «пракручвае» ў памяці абрывак дарогі: бачыць твар, спагадны позірк, усмешку, руку... Думае, а што было б, калі б яна спынілася? Калі б узяла той шалік? Ён жа даваў — чужы... чужой...

Значыць, ёсць на зямлі мужчыны! Ніна бачыла! Хоць... мімаходзь!

**Валянціна ДОЎНАР.**

# «Сдвину в пропасть сталактиты...»

## Пакручастыя дарогі Анатоля Дзеркача

**Давайце параўнаем дзве цытаты... Вось першая:**
***«У Міколы буракі —***
***Без папа і цуда —***
***Не узняць у дзве рукі:***
***Важаць па паўпуда!»***
**Вось другая:**
***«Догорают последние свечи.***
***Замирают прощальные зовы.***
***И грядущих величий предтечи***
***Для кладбищенских***
***склепов готовы».***
**Якімі вы ўяўляеце аўтараў гэтых строф? Ці шмат у іх агульнага? А ці можаце ўявіць, што і першы, і другі верш напісаў адзін чалавек?**
**Між тым гэта так... Аўтар абодвух вершаў — Анатоль Зіміёнка, вядомы як беларускі паэт Анатоль Дзяркач. Імя практычна забытае... Ды асоба надзвычай цікавая! Давайце аднавім факты яго жыцця з дапамогай дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.**

### СЯМ'Я ВАЛЬНАДУМЦАЎ

Пачнём цытатай з метрыкі: «...тысяча восемьсот восемьдесят седьмого года апреля шестого родился, а двадцать шестого крещён Анатолий; его родители: штатный сельский фельдшер Еремичского пункта, Новогрудского уезда, Минской губернии Григорий Игнатиев Симионко, православного вероисповедания и законная его жена Каролина — Мария Карлова, римско-католического исповедания...»

Заўважце адразу незвычайнасць: бацька — праваслаўны, маці — каталічка. Грыгорый і Марыя мусілі моцна кахаць адзін аднаго, калі прыналежнасць да розных канфесій ім не перашкодзіла...

Але калі Анатолю Зіміёнку было чатыры гады, ён асірацеў. І аказаўся на выхаванні старэйшай сястры Валерыі. Розніца ва ўзросце была вялікай: сястра ўжо працавала настаўніцай у Турцы.

Яшчэ заўважым, што сямейка была дужа вальнадумнай. У 1904-м, калі Валерыя з малодшым братам пераехалі ў Мінск, яе арыштавалі за рэвалюцыйную дзейнасць. Яна загінула ў Мінскай турме. Старэйшага брата, Аляксандра, яшчэ раней выслалі ў Іркуцкую губерню.

Цікава, што Аляксандр Зіміёнка значыцца ў спісе выпускнікоў Мінскага духоўнага вучылішча: у выпуску 1889 года ён сярод удастоеных пераводу ў 1 клас духоўнай семінарыі па першым разрадзе. А вось ён у разрадным спісе вучняў духоўнай семінарыі, у трэцім класе, па выніках 1891—1892 навучальнага года... Але, мяркуючы па ўсім, будучы святар аддаў перавагу рэвалюцыйнай дзейнасці перад духоўнай кар'ерай.

Зразумела, і малодшаму Анатолю лёсам было наканавана зрабіцца змагаром. Калі сястру арыштавалі, ён застаўся ў Мінску без сродкаў існавання... Як пісала яго дачка, «Захапіўшыся рэвалюцыйнай дзейнасцю, напярэдадні першай рускай рэвалюцыі 1905 года ў сутычцы з паліцыяй у гарадскім садзе быў паранены. З прастрэленай нагой ён трапіў у турму. На ўсё жыццё застаўся кульгавым. Прасядзеў у турме каля двух гадоў. Пасля, улічваючы яго маладосць, турэмнае заключэнне яму замянілі наглядам паліцыі аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі».

Юнаку пашанцавала: дзякуючы аднаму лібералу-чыноўніку ўладкаваўся сакратаром у гарадскую управу. А паралельна пісаў вершы...

У архіве-музеі літаратуры і мастацтва ёсць стос аркушаў з яго творамі 1904—1917 гг. на рускай мове, некаторыя надрукаваныя яшчэ на друкарцы з яцю. Вершы чуллівага, рамантычнага юнака, даволі перайманьныя, нагадваюць то Надсана, то Севяраніна...

*«Солнце сердце погубило.*
*Ночь глухая даст звезду.*
*Это будет. Это было.*
*Сам я к гибели пойду.*
*Сдвину*
*в пропасть сталактиты.*
*Шторы вечности спущу.*
*Нектар жизни недопитый*
*По пустыне расплещу».*

У 1907-м на старонках ліберальнай газеты «Голос провинции» з'явіўся верш Зіміёнкі: «На кострах врагам на страх // Мы снесём все пытки. // Друг! Не тронь — пускай огонь // Обратит нас в слитки!».

Былі і іншыя публікацыі... У 1912 годзе ажаніўся, любай Шурачцы прысвяціў шмат лірычных вершаў... І каб не рэвалюцыя, не ўтварэнне Беларускай савецкай рэспублікі і ўсплёск нацыянальнай культуры, магчыма, застаўся б Аляксандр Зіміёнка правінцыяльным рускамоўным паэтам, пра якога б не ўспомнілі...

### ТАЯМНІЦА МАЙСТЭРНІ КАТАРБІНСКАГА

Невядома, што паслужыла першым штуршком, каб пачаць пісаць на беларускай мове... Але з'явіўся на свет паэт-сатырык Анатоль Дзяркач. Псеўданім з сэнсам: дзяркач — венік з дубцоў, якім вымятаюць смецце...

І вершы былі такія ж жорсткія — народніцкія, з грубым гумарам... Тут ужо не Надсана, а Дзям'яна Беднага згадваеш.

Але ёсць у спадчыне Анатоля Дзеркача цудоўны, на вялікі жаль, прызабыты твор у прозе — «Абразкі з жыцця Палесся». Напісаны ў 1920 годзе, напоўнены лірыкай і нейкай талстоўскай філасофіяй... Што ні персанаж, беларускі мужык — проста Платон Каратаеў з «Вайны і міру». Ёсць там раздзел «Кальск», чарговы прыпынак героя-вандроўніка:

*«Вось мы ўжо і ў Кальску. Выпраг Яўхім каня, а я хаджу па вялікім садзе. Каля пустога вялікага дома ліпы старыя шумяць, забіты вокны, скрозь іх нічога не відаць... Нехта ідзе высокі худы, падазрона вочы глядзяць з-пад сваіх брывоў.*

*— Добры вечар! — здымаю я першы перад ім шапку.*

*— Вечар добры! — адказвае. — Адкуль самі, ці здалёку? — пытае.*

*— А як вам, пане дабрадзею, сказаць? — адпавядаю я. — Здалёку ці не здалёку, але ад раніцы едзем і вось тутака прымушаны адпачыць.*

*— Што ж, добра, дык прашу да мяне ў хату, — адказвае мой новы знаёмы.*

*— Дзякую, я вось сад аглядаю, — кажу я. — Вельмі добры!*

*— Праўда, сад добры, — згаджаецца ён.*

*— А што ў гэтай хаце? — зноў пытаю.*

*— Эх, — уздыхае ён, — у гэтай хаце жыў вялікі чалавек — «художнік» адзін, пэўне, бачылі яго малюнкі, абразы ён усё маляваў, Катарбінскі празвіча яго.*

*— Катарбінскі? — здзівіўся я. — Дык ён тутака жыў?*

*— Але жыў, гэта ж студыя яго, — адказаў ён і ўздыхнуў.*

*— Ці не можна было б паглядзець яе ўсярэдзіне? — запытаўся я.*

*— Чаму не? Але ўсё, што было ў ёй, зніштожана... Пойдзем, ключ разам са мной.*

*— Чаму зніштожана? — запытаўся я.*



*Мы ўвайшлі ўсярэдзіну таемнага дома праз вузкія з шыбамі дзверы і апынуліся ў вялікай зале ў два прасвета.*

*— Вось гэта і ёсць яго студыя, — паказаў ён на пустыя сцены.*

*Я стаяў і дзівіўся: на падлозе ляжалі паламаныя рамы, рваная папера, валяліся пэндзлі, фарбы, банкі з-пад алію, ну, быццам хто пагром вялікі ўчыніў у студыі маляра.*

*— Што дзівіцёся? — запытаў мой правадыр. — Гэтак зрабілі тыя, што людзей да святла, да сонца вялі.*

*— Хто? — не зразумеў я яго.*

*— А яны! Тыя, што рай на зямлі абяцалі!*

*— А-а! — уцяміў я. — Дык вось вы, братачкі мае...*

*Я доўга стаяў, як акамянелы, і зразумець і да гэтага часу не магу, навошта дзеля шчасця і святла народа зніштажаць тое, на чым не раз вочы гэтага самага народа маглі б адпачыць, адпачыць на пекным малюнку мастака?».*

Па-першае, гэта вельмі вальнадумна — заўважылі іронію наконт тых, што абяцаюць рай на зямлі? Па-другое, вельмі каштоўна для мастацтвазнаўцаў. Бо гаворка аб прызабытым сёння мастаку польскага паходжання — Вільгельме Катарбінскім. Ён быў надзвычай папулярны ў эпоху арт-нуво, маляваў містычныя карціны, выявы якіх распаўсюджваліся на паштоўках. Набыў маёнтак на Случчыне, у Кальску, дзе працаваў у 1890—1910 гады. Менавіта беларуская старонка яго жыцця, як сцвярджае мастацтвазнаўца Надзея Усава, самая цікавая і амаль невядомая.

Катарбінскі сапраўды маляваў абразы, рабіў фрэскі ў Траецкім касцёле ў суседніх з Кальскам Старчыцах. У Кальску Катарбінскі абсталяваў велізарную майстэрню. Пасля рэвалюцыі, магчыма, у 1918-м, перавёз сюды частку сваіх твораў з Кіева. Куды падзелася калекцыя? Даследчык Палеес калісь зрабіў выпіску з дакумента 1919 г. пра Мінскі абласны музей: «Нядаўна са Слуцка была вывезена інструктарам музея т. Кастэлянскім вялікая галерэя карцін мастака В. А. Катарбінскага ў колькасці 282 палотнаў, якія захоўваюцца ў памяшканні музея».

8 жніўня 1919 года Мінск занялі польскія войскі, і карціны Катарбінскага, хутчэй за ўсё, былі вывезены ў Польшу. Сёння толькі адна карціна, «Пейзаж», ёсць у фондах нашага Нацыянальнага мастацкага музея.

### СЯБРОЎСКІЯ ШАРЖЫ

А вось сяброўскія шаржы 1930-х на вядомых беларускіх пісьменнікаў з часопіса «Піянер Беларусі». Маляваў іх Мікалай Малевіч, а вершаваныя часткі падпісаныя ініцыяламі А. З. Усяго такіх шаржаў у архіве пяць: на Якуба Коласа, Міхася Лынькова, Янку Маўра, Аляксея Талстога, Алеся Якімовіча. Аб'ядноўвае «ахвяр» тое, што ўсе яны — аўтары нядаўна надрукаваных твораў для дзяцей. Вось, прыкладам, эпіграма на Якуба Коласа мае эпіграф: «У мінулым годзе выйшла паэма для дзяцей Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды», якую з вялікай цікавасцю чытаюць піянеры і школьнікі». Верш гучыць так:

*«Стары Талаш наш не старэе*
*Ні з галавы, ні з барады...*
*Малым і тым пісаць умее —*
*Ён майстра ў нас на ўсе лады!»*

Шарж на Янку Маўра прысвечаны яго кніжцы «ТВТ», на Алеся Якімовіча — публікацыі ў часопісе «Піянер Беларусі» вершаванай казкі «Каваль-Вярнідуб», на Аляксея Талстога — датычыцца «Прыгод Бураціна»... Эпіграма на Талстога дасціпна абыгрывае прозвішча пісьменніка:

*«Для старых пісаў ён шмат ,*
*Але ўспомніў і рабят:*
*Сеў, падумаў, напісаў —*
*І нічуць танчэй не стаў!»*

«А.З.» — гэта Анатоль Зіміёнка. А тэма дзіцячай літаратуры ўзнікла таму, што Дзяркач працаваў у часопісе «Піянер Беларусі». Сам шмат пісаў для дзяцей, тым больш у сям'і падрастала дачка Тамара. А яшчэ менавіта ён пераклаў на беларускую мову «Кім быць» Маякоўскага, «Мыйдадзір» Чукоўскага, творы Агніі Барто, Самуіла Маршака, Дзям'яна Беднага (якога відавочна пераймаў).

### «ВОЗ ДЗЯСЯТАК НАЗБІРАЎ ГНОЮ ДЛЯ РАСАДЫ»

Да таго, як у 1929-м трапіць у «Піянер Беларусі», Дзяркач працаваў у газеце «Беларуская вёска», рэдагаваў дадатак да газеты «Звязда» — сатырычны часопіс «Дубінка». Кожнае месца працы накладала адбітак на выбар тэм. У архіве захоўваюцца рукапісы дзвюх паэм Зіміёнкі. «Аграпаэма» «Міколава гаспадарка» апісвае, як добра гаспадарыць селянін Мікола і яго жонка Марына. «Не! Мікола не кулак, у таго не столькі, Ён — найболей — серадняк і не болей толькі».

Замест таго, каб выкрываць нядбайнасць сялян, Дзяркач апісвае пастаральны ідэал, як Мікола «попел ночамі цягаў у катух — на грады, воз дзясятак назбіраў гною для расады», як у яго «вуллі як каплічкі», «у сем пудоў адна аўца».

Паэма выйшла ў 1927 годзе. У тым жа годзе было прынята рашэнне аб стварэнні калгасаў, а ў 1928-м — аб масавай калектывізацыі. Так што паэма хутка стала неактуальнай, а праз год-другі такое захапленне гаспадаркай адзінаўласніка ўвогуле будзе немагчымым.

Другі рукапіс — паэма 1930 года «Бог удвох», якая «ставіць сваёй мэтаю — у старой баечнай форме даць новую антырэлігійную і палітычную сатыру». Паводле сюжэта, на зямлю спускаюцца Бог і святы Пётр. Трапляюць яны ў Заходнюю Беларусь, дзе апынаюцца ў польскай турме, вытрымліваюць катаванні, нават расстрэл, пасля якога цудам застаюцца жывымі. Пасля пераходзяць у Савецкую Беларусь, дзе таксама, схопленыя пагранічнікамі, апынаюцца ў турме... Толькі больш утульнай, чым польская, і з ветлівымі допытамі. «Сцены выбелены бела, добра вымыта падлога». Хлеб аржаны даюць, і вошы — не тыя, што ў польскай турме, дробныя, як мак.

### АД ТУРМЫ ДА ТУРМЫ

З прадмоў да твораў складваецца ўражанне, што Зіміёнка ўсяго асцерагаецца...

Асцярога была недарэмнай. Звернемся да ўспамінаў Сяргея Грахоўскага пра сакратара часопіса «Піянер Беларусі» Хведара Клімянка:

«Рэдакцыі піянерскіх выданняў былі ў доме № 25 на Камсамольскай вуліцы, змяшчалася там і бухгалтэрыя выдавецтва «Чырвоная змена». Амаль усе пісьменнікі часта заходзілі туды. Клімянок іх ведаў у твар і на следстве назваў сваімі знаёмымі. Разам з Клімянком стыльрэдактарам працаваў Анатоль Зіміёнка, вядомы як гумарыст Дзяркач».

Недзе ў вёсцы на Жлобіншчыне Клімянок знайшоў зборнік з артыкулам Троцкага, прывёз у Мінск і паказаў таварышам па інстытуце. Неўзабаве пра гэтае рэдкае выданне даведаліся ў шэрым доме на Савецкай вуліцы, арыштавалі ўсіх, хто яго толькі бачыў. Узнікла версія, што раскрыта трацкісцкая арганізацыя. Але ў пастку трапілі толькі жаўтаротыя юнакі. Не салідна. Патрэбен лідар. Успомнілі старога Зіміёнку з нейкім цьмяным мінулым. Вось і знаходка!»

Анатолю Дзеркачу было тады пад пяцьдзясят... Потым Грахоўскі згадвае, як апынуўся ў адной камеры з вядомым палярнікам Язэпам Сцяпурам, якога арыштавалі, як яшчэ дарэвалюцыйнага знаёмага Зіміёнкі: «Некалі Сцяпура і Зіміёнка спачувалі эсэрам. Калі гэта было, яны ўжо не помнілі самі, а для следчых яны былі знаходкаю, як натхніцелі і кіраўнікі контррэвалюцыйнай групы».

У новых засценках «кіраўніку трацкісцкай групы» Анатолю Зіміёнку давялося перажыць тое, што і ягоным героям з паэмы «Бог удвох» — акно да імітацыі расстрэлу, калі вязня вывозілі за горад і ставілі каля ямы.

5 верасня 1937 года Анатоль Зіміёнка быў расстраляны напраўду. У 1957-м яго рэабілітавалі.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот № 1 – офис** (административное помещение) общей площадью 15,6 кв. м, инв. номер 200/D-193558, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 6 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 34 782,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2 – офис** (административное помещение) общей площадью 115,6 кв. м, инв. номер 200/D-193559, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 7. **Условие аукциона:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона (кондиционер Mitsubishi FDCV A302HENR (наружный блок) (инвентарный номер 50043395)), на сумму 926,36 бел. руб. с НДС 20 % | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 248 400,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 3 – кафе** (помещение общественного питания) общей площадью 114,4 кв. м, инв. номер 200/D-193567, по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 22 – 14 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 245 160,00 бел. руб.** | |
| **Обременение по лотам 1–3:** **1.** Аренда. Подробная информация у Продавца. **2.** Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней после проведения аукциона (по лоту № 1) не позднее 5 рабочих дней после проведения аукциона (по лотам № 2–3). **Срок оплаты:** не позднее 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи (по лоту № 1) не позднее 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи (по лотам № 2–3). Передача предмета аукциона осуществляется не позднее 5 рабочих дней (по лоту № 1) и 3 рабочих дней (по лотам № 2–3) после полной оплаты покупателем стоимости предмета аукциона | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. Победителю аукциона (единственному участнику аукциона), обратиться за государственной регистрацией перехода прав на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 31.05.2022 г. | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **25.07.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.07.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1** | |
| **Магазин № 59** (здание специализированное розничной торговли) **116,2 кв. м,** инв. № 640/С-26842. Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, Покрашевский с/с, д. Покрашево** | |
